АБАРАНІЦЬ МОЛАДЗЬ АД НЕГАТЫЎНАГА ЎПЛЫВУ 11

АРХІВІСТ ПРА ПІСЬМЕННІЦКІЯ ТАЯМНІЦЫ 12

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

29 КАСТРЫЧНІКА 2024 г. АЎТОРАК № 211 (30345)

ЦЫТАТА ДНЯ

Ігар КАРПЕНКА, старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі:

«26 студзеня 2025 года — самы аптымальны час для правядзення выбарчай кампаніі. 2025 год завяршае пяцігодку. Ёсць неабходнасць прааналізаваць праграму сацыяльна-эканамічнага развіцця нашай краіны, як яна выконвалася і, зразумела, вызначыць стратэгію развіцця на будучую пяцігодку, асноўныя напрамкі ўнутранай і знешняй палітыкі. І, вядома ж, нававыбраны Прэзідэнт павінен уключыцца ў гэты працэс на ранняй стадыі фарміравання такога сур'ёзнага стратэгічнага дакумента, а не пасля праведзеных выбараў летам, калі ўжо фактычна нават бюджэт звярстаны наступнага года, не гаворачы ўжо аб пяцігадовых планах і праграмах. Другі, на мой погляд, немалаважны момант: мы павінны разумець, што змяненні і дапаўненні ў Канстытуцыю Рэспублікі Беларусь, якія былі ўнесены на рэспубліканскім рэферэндуме ў 2022 годзе, прадугледжвалі абнаўленне ўсіх галін улады, уключаючы прэзідэнцкую ўладу, па тых навацыях, якія былі вызначаны ў Канстытуцыі, у нашым заканадаўстве».

Спецыяльны рэпартаж

СВЯТА ДЛЯ КОЖНАГА

«Марафон адзінства» маляваў яркую старонку ў жыцці Жлобіншчыны

Фота БелТА.

Грамадска-культурная акцыя — сапраўды жывы, актыўны працэс, каласальны энергетычны ўзаемаабмен для спікераў, удзельнікаў, адрасатаў свята: жыхароў і гасцей гарадоў, якіх яна яднае. «Марафон адзінства» стаў унікальнай магчымасцю праводзіць выхадныя за самымі цёплымі, сяброўскімі сустрэчамі, абменьвацца шчырымі эмоцыямі... Менавіта такім агульным адчуваннем плыні, якой падхоплівае свята, дзяліліся жыхары і госці Жлобіна. У сталіцы металургаў падрыхтавалі насычаную і пазнавальную праграму для ўдзельнікаў «Марафону адзінства». Два дні акцыі парадавалі цікавымі сустрэчамі, знаёмствамі... Пра самыя яскравыя моманты — матэрыял карэспандэнта «Звязды». СТАР. 8—9

Рэгіёны

Тут пачынаецца будучыня

Чым здзіўляе Барысаўшчына?

Прадстаўнікі СМІ ўзялі ўдзел у другім этапе абласной акцыі «Адкрый Міншчыну. Будучыня пачынаецца тут!» Гэтым разам журналісты наведалі Барысаўшчыну. Карэспандэнт «Звязды» далучыўся да прэс-тура і высветліў, якімі дасягненнямі па праве можа ганарыцца Міншчына. СТАР. 5

КАРАТКА

- **Моладзі далей трэба працягваць традыцыі суверэннай і незалежнай Беларусі, заявіла Старшыня Савета Рэспублікі Наталля Качанава падчас першага пасяджэння Маладзёжнага савета (парламента) трэцяга склікання пры Нацыянальным сходзе.**
- Кітай дапамог Беларусі з 2008 года рэалізаваць у прамысловасці 27 праектаў на больш як $5 млрд.
- **Асабістыя рэчы Героя Савецкага Саюза Маршала Савецкага Саюза Васіля Данілавіча Сакалоўскага перадаў у дар Гродзенскаму дзяржаўнаму гісторыка-археалагічнаму музею ўнук знакамітагаваеначальніка Сяргей Сакалоўскі.**

ISSN 1990 — 763X

Год якасці

Фота Віктара ДРАЧОВА.

Сіла думкі

Вынаходніцтвы, якія мяняюць жыццё

На працягу ўсёй гісторыі чалавецтва вынаходніцтвы трансфармуюць свет, фарміруючы аснову для новых тэхналогій і новых магчымасцяў, пашыраючы кругагляд і змяняючы погляд на, здавалася б, невырашальныя праблемы. Патэнты ж, у сваю чаргу, адыгрываюць ключавую ролю ў свеце інавацый, забяспечваючы абарону ўнікальных ідэй. Днямі былі падведзены вынікі конкурсу «Найлепшы патэнт Беларусі». Расказваем, якія вынаходніцтвы і інавацыі — ужо частка нашай сучаснасці або ўваходзяць у паўсядзённае жыццё і як змяняюць яго ў лепшы бок. СТАР. 7

«І Беларусь, і Расія павінны абараняць свой рынак»

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Прэзідэнт правёў сустрэчу з першым віцэ-прэм'ерам Расійскай Федэрацыі

Размова, у прыватнасці, ішла аб сумесных беларуска-расійскіх праектах, якія найперш датычацца авія- і аўтамабілебудавання. Як звярнуў увагу Аляксандр Лукашэнка, апошнім часам з расійскім кіраўніцтвам шмат гаворыцца аб тым, што Захаду так і не ўдалося паставіць Беларусь і Расію на калені, прыціснуць і нахіліць. У гэтым, па словах кіраўніка дзяржавы, вялікая заслуга тых сектараў эканомікі, якія ўзначальвае Дзяніс Мантураў.

«Перш за ўсё — прамысловасць, — канкрэтызаваў беларускі лідар. — Мы паставілі перад сабой амбіцыйную задачу — зноў разам з расіянамі пераадолець залежнасць ад імпарту — і сур'ёзна заняліся імпартазамяшчэннем. Я думаю, што гэта вялікі кавалак работы вашай у Беларусі з нашым урадам, каб вызначыцца, як будзем дзейнічаць далей».

Аляксандр Лукашэнка ўдзячны Прэзідэнту і ўраду Расіі за фінансаванне многіх сумесных імпартазамяшчальных праектаў. Сярод іх — такі знакавы і глабальны праект, як вытворчасць самалёта «Асвей». «Для нас гэта ўвогуле, можна сказаць, новая гісторыя, — адзначыў Прэзідэнт. — Можа быць, з гэтага самалёта і пачнецца эра авіябудавання ў Беларусі. Вы чалавек вядомы ў гэтай сферы, у прамысловасці ў тым ліку, і, думаю, ваша падтрымка для нас будзе вельмі важная».

Па словах кіраўніка дзяржавы, сумесных праектаў дастаткова. «Нават больш, чым мы дамаўляліся, аб'ёмаў грошай, якія Расія вылучыла ў якасці крэдытаў, — удакладніў ён. — Магчыма, мы дамовімся аб тым, што Расія будзе зацікаўлена ў новых нашых праектах і будзе павялічана гэтае фінансаванне».

Аляксандр Лукашэнка нагадаў, што калісьці ў Беларусі адкрывалі новую эру ў вытворчасці аўтамабіляў. «Вельмі важнае таксама пытанне, — звярнуў увагу Прэзідэнт. — Вы ў Расіі больш, чым хто-небудзь, разумееце ў гэтай справе. Хацелася б, каб тыя непаразуменні або нейкія недагаворкі ў сувязі з імпартазамяшчэннем па легкавых аўтамабілях мы маглі пераадолець і на нашым сумесным рынку мы б выраблялі беларускія і расійскія аўтамабілі перш за ўсё».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў: ні для каго не сакрэт, што і Беларусь, і Расія павінны абараняць свой рынак. «А каб не трапіць з агню ды ў полымя, як я часта кажу (нашы калегі гэта разумеюць цудоўна), шляхі супрацоўніцтва з такімі дзяржавамі пазначаны, яны ёсць, каб не атрымалася так, як з заходнікамі: сышлі, усё кінулі, «працаваць не будзем», — канкрэтызаваў ён. — Праўда, сышлі — дзякуй. Няхай сыходзяць. Кампетэнцыі і людзі засталіся, сыравіны і рэсурсаў у нас хапае. Будзем вырабляць і замяшчаць іх тавары сваімі».

Аляксандр Лукашэнка заўважыў, што ад гэтага візіту першага намесніка старшыні ўрада Расійскай Федэрацыі ў Беларусь многае залежыць. «Мы з Прэзідэнтам Пуціным аб гэтым гаварылі і чакаем ва ўрадзе Расіі вынікаў вашага візіту ў Беларусь, — удакладніў ён. — Для таго каб, калі будуць нейкія пытанні да прэзідэнтаў, мы маглі ў найбліжэйшы час іх вырашыць. 5 студзеня — саюзны Вышэйшы дзяржсавет. Таму трэба расставіць усе кропкі над «і». Пажадана на ВДС. Каб і будучыя, і наступныя гады былі зразумелыя для Беларусі і Расіі ў супрацоўніцтве».

У сваю чаргу Дзяніс Мантураў падзякаваў за магчымасць абмяняцца меркаваннямі па пытаннях, якія стаяць у двухбаковым парадку дня. «Вы абсалютна правільна адзначылі, што эра развіцця Беларусі як дзяржавы з авіяцыйнай прамысловасцю актыўна сёння развіваецца, — акцэнтаваў увагу першы віцэ-прэм'ер Расіі. — І не толькі з улікам праекта «Асвей». Мы актыўна ўзаемадзейнічаем з прадпрыемствамі грамадзянскіх авіяцыйных заводаў Беларусі па вытворчасці кампанентаў. Гэта датычыцца і самалёта «Іл-76», і «Ту-214». Я разлічваю, што гэта тэндэнцыя будзе захоўвацца. Мы лінейку і самалётаў, і наменклатуры, і колькасць кампанентаў будзем пашыраць. У вас вельмі кампетэнтныя спецыялісты. Ёсць і тэхналагічнае абсталяванне, і, самае галоўнае, калектывы людзей, якія гатовы рэалізоўваць гэты праект».

Па словах Дзяніса Мантурава, у планах — абмеркаваць і сумесныя кірункі па імпартазамяшчэнні. «Нашай сумеснай тэхналагічнай незалежнасці ад заходніх краін, — удакладніў ён. — Сапраўды, гэта больш за 100 мільярдаў рублёў прадастаўленых пазык з боку Расійскай Федэрацыі па многіх сектарах прамысловасці. Гэта і мікраэлектроніка, і машынабудаванне, і металургія, хімія. Гэта сапраўды будзе добры ўнёсак у нашу з вамі агульную скарбонку Саюзнай дзяржавы па нарошчванні кампетэнцый і індустрыяльнага патэнцыялу».

Вераніка КАНЮТА.

У тэму

Як адзначыў у размове з журналістамі **першы намеснік старшыні ўрада Расійскай Федэрацыі Дзяніс МАНТУРАЎ,** узаемадзеянне паміж дзвюма краінамі актыўна развіваецца. Асабліва, па яго словах, цяпер, калі Захад імкнецца аказваць максімальны ціск на Расію і Беларусь з пункту гледжання пастаўкі тэхналагічнага абсталявання і камплектуючых агрэгатаў. «Мы паставілі перад сабой задачу — выйсці на ўзровень тэхналагічнага суверэнітэту, які будзе дазваляць мець і свае асноўныя фонды (маюцца на ўвазе станкі, абсталяванне, свае агрэгаты і камплектуючыя) для таго, каб забяспечыць вытворчасць той прамысловай прадукцыі, у якой ёсць неабходнасць дзвюх эканомік — Расіі і Беларусі, — канкрэтызаваў першы віцэ-прэм'ер Расіі. — Мы з Аляксандрам Рыгоравічам зверылі гадзіннікі па тых праектах, па якіх Расія дала пазыку на 100 мільярдаў рублёў. Гэта датычыцца галіны мікраэлектронікі ў першую чаргу, хіміі, металургіі, машынабудавання — там, дзе мы бачым сумеснае выкарыстанне той прадукцыі, якая будзе вырабляцца на тэрыторыі Беларусі».

Кажучы аб узаемадзеянні ў авіяцыйнай індустрыі, Дзяніс Мантураў паведаміў, што самалёт «Асвей» ужо знаходзіцца ў актыўнай фазе распрацоўкі і будзе вырабляцца на тэрыторыі дзвюх краін.

Акрамя таго, на сустрэчы з Прэзідэнтам абмяркоўваліся пытанні рэалізацыі Дэкрэта № 3 Саюзнай дзяржавы па адзінай прамысловай палітыцы ў частцы выкарыстання мер, інструментаў фінансавай падтрымкі дзвюх дзяржаў.

Што датычыцца павелічэння аб'ёмаў фінансавання сумесных праектаў, Дзяніс Мантураў паведаміў, што гэтае пытанне будзе абмяркоўвацца і ў далейшым на перагаворах ва ўрадзе Беларусі з прэм'ер-міністрам Раманам Галоўчанкам і профільным віцэ-прэм'ерам. Пры гэтым наведванне ў рамках гэтага візіту першым намеснікам старшыні расійскага ўрада прадпрыемстваў «БЕЛАЗ» і «БЕЛДЖЫ», па яго словах, таксама дасць дадатковую магчымасць для разумення, у якіх кірунках можа быць пашырана індустрыяльная кааперацыя, у тым ліку ў частцы магчымых дадатковых крыніц фінансавання гэтых праектаў.

«НАМ ТРЭБА БЫЦЬ НЕЗАЛЕЖНЫМІ ПА ЎСІХ КІРУНКАХ»

Аляксандр Лукашэнка вызначыў прыярытэтныя кірункі супрацоўніцтва з Сахалінскай вобласцю

У якасці губернатара Валерый Лімарэнка знаходзіцца з візітам у Беларусі ўпершыню. Аднак да новага прызначэння наведваў нашу краіну рэгулярна: будучы кіраўніком ніжагародскага «Атамэнергапраекта», ён асабіста курыраваў работу па падрыхтоўцы да ўзвядзення першага энергаблока Беларускай АЭС. Менавіта за ўдзел у гэтай найважнейшай будоўлі кіраўнік Сахалінскай вобласці ўдастоены Падзякі Прэзідэнта Беларусі. З уручэння ўзнагароды і пачаліся перагаворы Аляксандра Лукашэнкі з губернатарам гэтага ўсходняга рэгіёна Расійскай Федэрацыі. Кіраўнік дзяржавы яшчэ раз выказаў удзячнасць губернатару Сахалінскай вобласці за ўклад у будаўніцтва гэтага стратэгічнага інвестыцыйнага праекта ў Беларусі.

Фота БелТА.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што гэтым разам Валерый Лімарэнка прыехаў у Беларусі ў якасці кіраўніка вялікага, цікавага і вельмі роднага для нашай краіны рэгіёна Расійскай Федэрацыі. «У цэлым уклад далёкаўсходніх рэгіёнаў у агульную скарбонку нашага гандлю — Беларусі і Расіі — менш за працэнт, або прыкладна 350 мільёнаў доларaў, — канстатаваў кіраўнік дзяржавы. — Аб'ёмы каласальныя. Усё-ткі 350 мільёнаў доларaў на такую адлегласць — гэта прыстойныя аб'ёмы».

Разам з тым Прэзідэнт заўважыў, што з улікам нашых магчымасцяў гэта мала. «Я думаю, што ў выніку вашай работы ў Беларусі і перагавораў, якія адбудуцца, мы выйдзем на больш сур'ёзнае супрацоўніцтва», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка і агучыў прыярытэтныя напрамкі двухбаковага ўзаемадзеяння.

Імпартазамяшчэнне

Прэзідэнт праінфармаваў, што напярэдадні сустрэчы з губернатарам Сахалінскай вобласці праблема імпартазамяшчэння абмяркоўвалася з першым віцэ-прэм'ерам Расіі. «Нам трэба быць незалежнымі па ўсіх кірунках, — канкрэтызаваў беларускі лідар. — Нам трэба зрабіць так, каб не да нас везлі шматлікага роду тавары, а ад нас везлі і прыязджалі сюды, у Расію і Беларусь, прасілі, каб мы ім прывезлі тыя ці іншыя тавары».

Пры гэтым беларускі лідар падкрэсліў, што вельмі многае ўжо зроблена. Расія, па яго словах, крэдытуе нашы сумесныя праекты, якіх больш, чым планавалася. Сумесныя праекты, як канкрэтызаваў Прэзідэнт, датычацца розных сфер: пачынаючы ад вытворчасці мікраэлектронікі, заканчваючы самалётабудаваннем. «Мы павінны быць незалежнымі ў эканоміцы. І думаю, што за наступную пяцігодку (калі, вядома, на нас будуць так ціснуць) мы выйдзем на практычнае поўнае імпартазамяшчэнне. Калі ціску не будзе — можам расслабіцца. Таму гэтыя ўсе санкцыі — і час магчымасцяў».

Інавацыі і экалагічны транспарт

Беларусь гатова супрацоўнічаць з Сахалінскай вобласцю і ў плане інавацый, экалагічнага транспарту. Прэзідэнт праінфармаваны, што ў гэтым расійскім рэгіёне праводзіцца ўнікальны эксперымент па стварэнні вугляроднай нейтральнасці. Па яго словах, у рамках гэтага эксперымента ў Сахалінскай вобласці будзе працаваць і першы ў свеце велікагрузны аўтамабіль «БелАЗ».

«Мы таксама вельмі многае робім у плане экалагічнага транспарту, — паведаміў кіраўнік дзяржавы. — Пераводзім на электратранспарт пасажырскі транспарт. Мы ўжо два маршруты вызначылі — ад Мінска да Жодзіна і ад Магілёва да Шклова. Гэта па 40—50 кіламетраў без дазапраўкі будуць хадзіць электрычныя аўтобусы. Калі ёсць жаданне, мы можам папрацаваць і ў вас».

Лагістыка і харчаванне

Аляксандр Лукашэнка нагадаў пра магчымасці Беларусі і ў плане транспартнай лагістыкі і будаўніцтва. «Гатовы з вамі працаваць у вашым праекце па стварэнні міжнароднага транспартна-лагістычнага хаба за кошт мадэрнізацыі Карсакоўскага марскога гандлёвага порта і будаўніцтва заводаў па перапрацоўцы рыбнай прадукцыі, — унёс прапанову беларускі лідар. — Увогуле па рыбе, я б сказаў, па яе спажыванні вельмі сур'ёзная сітуацыя. Я Уладзіміра Уладзіміравіча прасіў, каб нам выдзелілі квоту для лоўлі рыбы і перапрацоўкі. Дзякуй, выдзелілі. Ажно на 10 гадоў наперад». Па словах Прэзідэнта, завод па перапрацоўцы рыбы ў найбліжэйшы час будзе пабудаваны на тэрыторыі нашай краіны.

Кажучы аб узаемадзеянні ў сельскай гаспадарцы і харчаванні, Аляксандр Лукашэнка запэўніў, што, калі ў кіраўніцтва Сахалінскай вобласці будуць пэўныя пажаданні ў гэтым плане, Беларусь таксама гатова да супрацоўніцтва. Гэта, па словах кіраўніка дзяржавы, датычыцца і многіх іншых пытанняў, да якіх будзе інтарэс.

«Вы ведаеце, што вы нам людзі не чужыя. Яшчэ ў часы Кажамякі (цяперашні губернатар Прыморскага краю. — **«Зв».**) мы працавалі ў Сахаліне і нешта зрабілі, таму адлегласць тут не мае ніякага значэння, — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. — Будзем з вамі супрацоўнічаць і працаваць. Яшчэ раз удзячны за тое, што вы зрабілі для Беларусі. Упэўнены, што мы яшчэ нямала з вамі зробім».

Праграма візіту дэлегацыі Сахалінскай вобласці ў Беларусь даволі шырокая. У планах —наведаць ААТ «Амкадор» і Беларускую атамную электрастанцыю, Парк высокіх тэхналогій і ААТ «БелАЗ», азнаёміцца з выстаўкай тэхнікі беларускай вытворчасці на Мінскім трактарным заводзе. Акрамя таго, шэраг сустрэч будзе праведзена ва ўрадзе.

Вераніка КАНЮТА.

«Мы справімся ў складанай сітуацыі — разабрацца з гэтымі палітычнымі пытаннямі»

Аб чым яшчэ Прэзідэнт Беларусі гаварыў з журналістамі на палях саміту БРІКС

Саміт БРІКС, які на мінулым тыдні прайшоў у Казані, дагэтуль у топе абмеркавання СМІ ва ўсім свеце. Удзел у гэтым прадстаўнічым мерапрыемстве Прэзідэнта Беларусі (па выніках саміту наша краіна атрымала статус партнёра) выклікаў вялікі інтарэс з боку журналістаў. Магчымасцю задаць пытанні беларускаму лідару скарысталіся буйныя замежныя СМІ. Мы ўжо пісалі пра падрабязнасці інтэрв'ю Аляксандра Лукашэнкі тэлеканалу «Бі-Бі-Сі» і выданню «Известия». Сёння раскажам пра размову з журналістамі «Цэнтральнага тэлебачання» на НТВ і Паўлам Зарубіным, які працуе на тэлеканале «Расія».

АБ БАЧАННІ БЕЛАРУСІ Ў БРІКС

Журналісы НТВ у Аляксандра Лукашэнкі найперш пацікавіліся перспектывамі ўступлення Беларусі ў БРІКС. Кіраўнік дзяржавы расказаў, што Беларусь перад тым, як стаць членам БРІКС, спачатку павінна папрацаваць з арганізацыяй у якасці партнёра. Адпаведны статус, паводле яго слоў, узгоднены на саміце ў Казані.

«І гэта ступень для ўсіх цяпер абавязковая. Такое прынята рашэнне пастаяннымі членамі БРІКС: той, хто хоча ўступіць у БРІКС, павінен прайсці гэту ступень. Таму Беларусь — краіна-партнёр для БРІКС», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Журналісты адзначылі, што напярэдадні саміту міністр замежных спраў Максім Рыжанкоў назваў уступленне ў БРІКС марай Беларусі.

«Наш міністр гэта так успрымае, што гэта мара. Я б так ужо вызначана, мякка кажучы, не выказваўся, паколькі наша мара ў тым, каб БРІКС стала марай для многіх дзяржаў, — пракаментаваў гэту заяву Прэзідэнт. — Давайце шчыра (вы гэта бачыце не горш за мяне): у самой арганізацыі ёсць праблемы. Многа, мала — пытанне густу, але праблемы ёсць. Нават паміж вядучымі дзяржавамі — заснавальніцамі гэтай арганізацыі. Можа быць, БРІКС і дапаможа пераадолець усе гэтыя праблемы».

Кіраўнік дзяржавы, у прыватнасці, звярнуў увагу, што ў час саміту многія краіны больш выказваліся аб сваіх праблемах, чым аб нейкіх глабальных ініцыятывах. Расія ж, наадварот, унесла вельмі сур'ёзныя прапановы, заўважыў Аляксандр Лукашэнка. «Не проста тое, што датычыцца толькі Расіі, але датычыцца ўсіх сёння або закране заўтра», — адзначыў ён.

Размова, напрыклад, аб ініцыятыве распрацаваць новую міжбанкаўскую сістэму, якая магла б замяніць SWIFT або працаваць паралельна з ёй. «Пакуль я яшчэ не магу сказаць, што гэта разумная прапанова Расіі падтрымана. Як і іншыя. Пра што гэта гаворыць? Што нават заснавальнікі (пяць краін) і тыя, якія сталі пастаяннымі членамі БРІКС, сёння выходзяць з таго, «наколькі гэта мяне будзе датычыцца». Кожны бачыць там сябе, а арганізацыя для таго, каб бачыць агульныя праблемы. Вось чаго пакуль не хапае БРІКС», — падкрэсліў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка прызнаўся, што насцярожана ўспрымае і бюракратычны бок пытання — працэс прыёму ў члены арганізацыі.

«Да прыкладу, чаму б Турцыю не прыняць у склад БРІКС? Гэта вельмі сімвалічна, і буйная краіна. Сімвалічна ў чым? Гэта пакуль адзіная краіна НАТА, якая прапанавала свой удзел у БРІКС. Не, з падачы нейкіх, можа, бюракратаў пачалі выпрацоўваць нейкія крытэрыі прыёму: калі ты адпавядаеш гэтым крытэрыям, мы табе даём партнёра, а потым ужо будзем думаць, прымаць цябе ці не прымаць, хутчэй за ўсё, прымем. Я баюся, што гэты бюракратызм можа ўтапіць, як і многія іншыя арганізацыі, і БРІКС», — сказаў Прэзідэнт.

Кіраўнік дзяржавы нагадаў, што ў з'яўлення БРІКС былі як суб'ектыўныя прычыны — жаданне краін працаваць разам, так і аб'ектыўныя — імкненне да шматпалярнага свету. «Гэта аб'ектыўны фактар, яго сёння прытушыць, прыціснуць немагчыма. І сёння, калі свет шалёна мяняецца, вельмі хутка час мяняецца, трэба паспяваць за гэтым часам. Калі мы не здольныя паспяваць, то гэтая арганізацыя можа стаць з часам (прытым у найбліжэйшай будучыні) арганізацыяй маргінальнай», — лічыць беларускі лідар.

«Больш за тое, вельмі важна, што калектыўны Захад, перш за ўсё Злучаныя Штаты Амерыкі, сёння разгарнуў шалёную барацьбу супраць БРІКС для таго, каб не дапусціць гэты шматпалярны свет, за які спрабуе выступаць БРІКС. Таму вельмі шмат яшчэ праблем», — канстатаваў Аляксандр Лукашэнка.

Пляцоўку саміту ў Казані беларускі бок выкарыстаў і для правядзення двухбаковых перагавораў, бо тут можна было сустрэць прадстаўнікоў розных кантынентаў. І гэта, несумненна, адзін з плюсаў такіх фарматаў.

«Але мы чакаем вырашэння ў БРІКС агульных праблем, якія будуць хваляваць усе дзяржавы, а не толькі асобныя», — рэзюмаваў беларускі лідар.

АБ РАСІЙСКА-ЎКРАІНСКІМ КАНФЛІКЦЕ

Гаворачы аб расійска-ўкраінскім канфлікце, Аляксандр Лукашэнка заявіў, што прапанаваны Уладзімірам Зяленскім план не адпавядае сітуацыі на фронце. «У нас з вамі выпрацаваўся наратыў, што мір ва Украіне залежыць ад Штатаў і Еўропы: захочуць яны — будзе мір, не захочуць — не будзе. Апошнім часам, на мой погляд, сітуацыя памянялася: амерыканцы, бачачы сітуацыю на фронце і ў Курскай вобласці, і асабліва еўрапейцы, міру жадаюць больш, чым сам Зяленскі. Больш за ўсё цяпер упіраецца Зяленскі, прапаноўваючы розныя фарматы, розныя планы мірных перагавораў, якія больш падобныя да лозунгаў. І гэтыя прапановы, самае галоўнае, сёння не адпавядаюць таму, што адбываецца на зямлі», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Ён адзначыў, што Расія павольна, але наступае на асноўных напрамках ва Украіне, а частка ўкраінскіх падраздзяленняў ужо выцесненая з захопленай імі тэрыторыі Курскай вобласці. «Расіяне трэць захопленай тэрыторыі вызвалілі, — канстатаваў Прэзідэнт. — На сённяшні дзень, можа, і больш. Але, самае галоўнае, у Курскай вобласці расіяне навучыліся з імі ваяваць, бо яны зайшлі групамі: дыверсійна-разведвальнымі групамі, потым іншыя падраздзяленні, групамі тактычных батальёнаў. Гэта было крыху нечакана для расіян у цэлым і ў прыватнасці вайна гэтымі групамі — партызанскія дзеянні ўкраінцаў. Расіяне хутка адаптаваліся да гэтага і пачалі выцясняць украінцаў».

Расійскія вайскоўцы заяўляюць, што да канца снежня могуць вызваліць усю тэрыторыю Курскай вобласці. А значыць, гэта аперацыя стане для Украіны правалам, заявіў кіраўнік дзяржавы. Расіяне паспяхова наступаюць і ў Данецкай вобласці. «І вось мірны план Уладзіміра Аляксандравіча Зяленскага і тое, што адбываецца на фронце і ў Курскай вобласці, не карэлююцца. «План перамогі» яго называюць. Дзіўная назва тут ужо не да перамогі, дай бог спыніцца», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка.

Кіраўнік дзяржавы заявіў, што падтрымлівае падключэнне КНР і Бразіліі да спроб мірна ўрэгуляваць канфлікт ва Украіне. Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Кітай і Бразілія не сапернікі Расіі, але хочуць мірнага ўрэгулявання канфлікту. Цяпер абедзве краіны прасоўваюць сумесна распрацаваны мірны план па ўрэгуляванні ўзброенага канфлікту ва Украіне. «Я падтрымліваю само ўключэнне ў гэты працэс кітайцаў і бразільцаў», — сказаў беларускі лідар. Канкрэтныя ж пытанні, такія як тэрытарыяльнае размежаванне, умовы спынення ваенных дзеянняў і адвод войскаў ад лініі судакранання, павінны вырашацца паміж бакамі канфлікту выключна за сталом перагавораў, пераканаць Прэзідэнт. «Самае галоўнае цяпер — пасадзіць усіх за стол перагавораў», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. Гэтую ж мэту ставіць Кітай і Бразілія, дадаў ён.

АБ КАНТАКТАХ ПАМІЖ БЕЛАРУССЮ І УКРАІНАЙ

У інтэрв'ю Аляксандр Лукашэнка заявіў, што пэўныя кантакты паміж Беларуссю і Украінай захоўваюцца. Прэзідэнт растлумачыў, што ў СМІ мільгаюць навіны аб пасрэдніцтве ААЭ у абмене целамі і ваеннапалоннымі паміж Расіяй і Украінай, але сам працэс арганізаваны пры непасрэдным удзеле беларусаў. «Гэта ўсё адбываецца на нашай тэрыторыі. Гэта ўсё адбываецца нашымі рукамі», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

Ён нагадаў, што апошнія такія абмены адбыліся літаральна нядаўна. «І далей, калі расіяне гэтага захочуць (украінцы хочуць), мы будзем садзейнічаць гэтаму працэсу. Значыць, ва ўкраінскага боку няма адпрэчвання таго, што яны будуць працаваць з намі і практычна на нашай тэрыторыі. Мы гэтую гуманітарную місію выконваем і будзем выконваць, у тым ліку і па дзецях — упаўнаважаны іх, упаўнаважаны ваш па правах дзіцяці, наш упаўнаважаны і дэпутаты нашага парламента ў гэта ўключаны. Я гэта падтрымліваю», — падкрэсліў Прэзідэнт.

«Таму ў нас нармальныя з імі (украінцамі. — **«Зв.»**) кантакты, мы можам перадаць ім любы сігнал. Калі ў іх ёсць пытанні, яны могуць іх задаць нам і могуць праз нас перадаць нейкія пытанні Расійскай Федэрацыі, перш за ўсё ваенным. Калі ёсць такія пытанні, мы перадаём адразу ж», — дадаў Аляксандр Лукашэнка.

На адпаведныя кантакты, паводле яго слоў, упаўнаважаны некаторыя дэпутаты, дыпламаты і ваенныя. «Усё, на што ўкраінцы згодны», — сказаў Прэзідэнт.

АБ ПАЎНОЧНА-КАРЭЙСКІХ ВОЙСКАХ НА ФРОНЦЕ

Кіраўніка дзяржавы папрасілі пракаментаваць сцвярджэнні аб тым, што Паўночная Карэя адправіла ва Украіну войскі для ўдзелу ў баявых дзеяннях на баку Расіі. Дарэчы, такое пытанне Прэзідэнту Беларусі журналісты задавалі ў Казані неаднаразова.

«Я ўжо спытаў (можа быць, жартам) у свайго добрага сябра Эрдагана: «Вы (НАТА. — **«Зв.»**) аб паўночнакарэйскіх вайскоўцах кажаце (ён жа член НАТА) для таго, каб знайсці падставу для ўводу натаўскіх войскаў ва Украіне?» — расказаў Аляксандр Лукашэнка аб незвычайнай размове з турэцкім лідарам. Аднак што адказаў на гэта пытанне Рэджэп Таіп Эрдаган і чым у прынцыпе завяршылася гутарка двух лідараў, кіраўнік беларускай дзяржавы расказаць не паспеў: журналіст вырашыў адвесці размову ў іншы бок.

Прэзідэнт Беларусі падкрэсліў, што не верыць у прысутнасць ваенных Паўночнай Карэі ва Украіне, тым больш ніхто так і не прадставіў ніякіх доказаў. Ды і ў Расіі няма неабходнасці прыцягваць да канфлікту трэці бок, адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

«Гэта можа быць эскалацыяй канфлікту (калі Расіі іншыя краіны дапамагаюць, значыць, уваздзём натаўскія кантынгенты, каб усё ж дабіць Расію, як яны планавалі). Думаю, што гэта, як вы сказалі, укід для таго, каб атрымаць нагоду для нейкіх дзеянняў. Магчыма, для ўводу сваіх падраздзяленняў або дазволу дальнабойнай зброяй біць па тэрыторыі Расіі (у іх жа ў партфелі шмат хацелак з боку Украіны)», — выказаў меркаванне кіраўнік дзяржавы.

АБ ВЫБАРАХ І ЗНОЎ АБ УКРАІНЕ

У інтэрв'ю расійскаму журналісту Паўлу Зарубіну, адказваючы на пытанне аб маючай адбыцца выбарчай кампаніі ў Беларусі, кіраўнік дзяржавы заявіў: «Добра пройдуць (выбары. — **«Зв.»**). Я ў гэтым ніколькі не сумняваюся. Так, напэўна, ты і сам не сумняваешся, што мы справімся ў складанай сітуацыі — разабрацца з гэтымі палітычнымі пытаннямі».

Гаворачы аб перспектывах завяршэння канфлікту ва Украіне, Аляксандр Лукашэнка сказаў: «Цяпер гэта ўжо залежыць не столькі ад калектыўнага Захаду, колькі ад самога Уладзіміра Зяленскага. Гэта ўжо такі маленькі паварот. Нядаўна, сустракаючыся з прадстаўнікамі Захаду, я зразумеў, што яны хочуць міру, але яны не могуць націснуць на Зяленскага. Таму што было абяцана: ціску не будзе — будзе ўсялякая падтрымка».

«Яму зусім свой народ не шкада?» — задаў удакладняльнае пытанне журналіст.

«Яму плываць на гэта. Выходзячы з яго паводзін. Хоць так падумаеш, я ж яго добра і да гэтага ведаў — недурны чалавек. Але, відаць, амбіцыі займелі месца. Але гэта не месца для амбіцый. Таму сапраўды — не шкада», — адказаў Аляксандр Лукашэнка.

Ён канстатаваў, што сітуацыя мяняецца кожны дзень. «І ўжо непакоіць тое, што Расія можа ўсіх паслаць і сказаць: «На зямлі сітуацыя змянілася». Гэта значыць, не пайшлі ў свой час на перагаворы, а сёння сітуацыя памянялася, і сур'ёзна на карысць Расіі, — сказаў Прэзідэнт. — Мне здаецца, што, як кажуць расійскія вайскоўцы, Курскую вобласць яны вызваляць да канца снежня. Вельмі шмат загінула там украінцаў. І расіянам, вядома, няпроста. Забіваем адзін аднаго без патрэбы. А на асноўнай лініі фронту зрухі вельмі сур'ёзныя».

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што «пуцінская стратэгія» — крок за крокам, спакойна рухацца наперад — падзейнічала. У Данбасе лінія фронту ссоўваецца на захад. «Таму адсюль і лозунгі Зяленскага, якія ён называе «план перамогі». Таму што сур'ёзная сітуацыя на фронце», — зрабіў выснову беларускі лідар.

Паводле прэс-службы Прэзідэнта.

❍ У тэму

Адказваючы на пытанні прадстаўнікоў СМІ, **губернатар Сахалінскай вобласці Валерый ЛІМАРЭНКА** адзначыў, што за апошнія дзевяць гадоў гэты расійскі рэгіён набыў у Беларусі 900 адзінак тэхнікі. «У галіне сельскай гаспадаркі, кар'ерныя самазвалы («БелАЗы», напрыклад), аўтобусы», — канкрэтызаваў ён.

Валерый Лімарэнка расказаў, што запрасіў Аляксандра Лукашэнку наведаць Сахалін. «Я сказаў, што вы прыедзеце ў Южна-Сахалінск, дзе так жа чыста, як у Мінску, і ходзіць тэхніка такая ж, як у Мінску», — канстатаваў губернатар.

Кажучы аб ажыццяўленні эксперымента па вугляродная нейтральнасці ў Сахалінскай вобласці, кіраўнік расійскага рэгіёна паведаміў, што ў гэтым плане яны зацікаўлены ў партнёрстве з Беларуссю. «У прыватнасці, мы паедзем на «БелАЗ» для таго, каб абмяркоўваць перспектывы эксперымента — выкарыстанне вадароднага «БелАЗа», — канкрэтызаваў ён. — На «Амкадоры» — вялікая праграма па камунальнай тэхніцы, па пераводзе гэтай тэхнікі на газ. Вы ведаеце аб тым, што ў Расіі ўнутранае спажыванне газу павялічваецца, таму гэта вельмі актуальна і цікава. Мы поўнасцю пераводзім свой рэгіён на газавыя рухавікі. Гэта прынцыповая лінія».

Губернатар патлумачыў, чаму ў рэгіёне аддаюць прыярытэт беларускай тэхніцы. «Беларуская тэхніка перамагае на конкурсах, — сказаў ён. — Яна па якасці добрая, выдатная і па цане прымальная. Нашы механікі вылучаюць гэтую тэхніку і прымаюць рашэнне, што яе трэба набываць. У гэтым сэнсе ўсё проста. Што датычыцца лагістыкі, Сахалін — цэнтр транспартных артэрый, і ў гэтым сэнсе мы можам супрацоўнічаць з любым кутком свету. Тут ніякай праблемы няма».

Кажучы аб супрацоўніцтве ў галіне экалагічнага транспарту, кіраўнік рэгіёна паведаміў, што абодва бакі павінны прайсці даволі складаны шлях, дзе трэба праявіць цярпенне. «Зразумела, што вадарод сёння даражэйшы, чым дызельнае паліва, — растлумачыў Валерый Лімарэнка. — Але гэта паліва будучыні. І калі сёння мы разам пойдзем у гэты праект, тады з часам, калі цэны зблізяцца, у нас з'явіцца вопыт работы з вадародам, а гэта вельмі складаная тэхналогія. Гэта высокатэхналагічныя спецыялісты, якімі трэба займацца. Такіх людзей павінна быць тысячы. Для гэтага павінны прайсці гады». Па словах губернатара, на Сахаліне ствараецца інжынерная вадародная школа, да дзейнасці якой з вялікім задавальненнем гатовы падключыць спецыялістаў Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі.

Кажучы аб зацікаўленасці Беларусі павялічыць пастаўкі рыбы, Валерый Лімарэнка паведаміў, што Сахалінская вобласць прапанавала свае магчымасці, лагістыку і партнёрства для таго, каб забяспечыць беларусаў гэтай сыравінай для далейшай перапрацоўкі. «Такая магчымасць ёсць, — дапоўніў ён. — Больш за тое, у Беларусі ёсць квоты, якія, я прапанаваў, можна выкарыстаць з нашымі рыбакамі».

Акцыя

Ігар СЕРГЯЕНКА:

«Сакрэт поспеху — у згуртаваным калектыве»

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў падарылі лесу новае жыццё

26 кастрычніка дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь узялі ўдзел у рэспубліканскай акцыі «Дай лесу новае жыццё». Парламентарыі на чале са Старшынёй Палаты прадстаўнікоў Ігарам Сергяенкам адправіліся ў Крупскі раён — адно з месцаў, што найбольш пацярпела ў выніку ўрагану, які прайшоў летам. Народныя выбраннікі ў гэты дзень памянялі строгія касцюмы на боты ды пальчаткі і сталі актыўна высаджваць іглічныя дрэвы на пацярпелай тэрыторыі. Карэспандэнты «Звязды» таксама далучыліся.

Дадзеная акцыя накіравана на аднаўленне пашкоджаных ураганам ветравальна-бураломных участкаў. Для выканання даручэння кіраўніка дзяржавы па лесааднаўленні былі высаджаны саджанцы елкі і хвоі на ўчастку плошчай 2,8 гектара на тэрыторыі Халопеніцкага лясніцтва Крупскага лясгаса.

ЯШЧЭ ЛЕПШАЙ І ПРЫГАЖЭЙШАЙ

«Настрой працоўны, бадзявы. Уся краіна адгукнулася на заклік нашага Прэзідэнта і бярэ ўдзел у гэтай выдатнай акцыі «Дай лесу новае жыццё», — распавёў журналістам **старшыня Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Ігар СЕРГЯЕНКА.** — Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў не засталіся ўбаку і ўключыліся ў працу ва ўсіх акругах пачынаючы з 12 кастрычніка».

У гэтую суботу тут працавалі цэнтральны апарат, сакратарыят, дэпутаты ад горада Мінска, Мінскай вобласці, члены іх сем'яў. «Нам трэба будзе пасадзіць лес на тэрыторыі да трох гектараў. Вядома ж, такая праца робіць нашу краіну яшчэ лепшай, прыгажэйшай. Мы ведаем, колькі загінула дрэў, асабліва ў Гомельскай вобласці, з-за ўрагану, таму лес трэба аднаўляць. Гэта, па сутнасці, нашы лёгкія. Праз сем гадоў гэта ўжо будзе малады лес пры якасным выкананні работ», — адзначыў Ігар Сергяенка.

Ён дадаў, што дэпутаты рэгулярна бяруць удзел у падобных мерапрыемствах: у суботніках, прыборцы тэрыторыі, самі арганізоўваюць у сваіх акругах падобныя работы па добраўпарадкаванні. «Сакрэт поспеху — у згуртаваным калектыве», — падсумаваў старшыня Палаты прадстаўнікоў.

НЯЛЁГКАЯ РАБОТА ЛЕСАВОДА

У гэтую суботу парламентарыі высадзілі каля 18 тысяч дрэў. «Добры Лясны кодэкс можна напісаць толькі пасля таго, як сам пасадзіў лес і разумееш, якая работа нашага лесавода, — падзяліўся **першы намеснік міністра лясной гаспадаркі Аляксандр ДРАГУН.** — Акцыя «Дай лесу новае жыццё» прымеркавана да таго, што мы ўсе разам аднаўляем пацярпелыя пасля ліпеньскага ўрагану нашы лясы. Сёння высадзім каля 18 тысяч дрэў».

Па яго словах, пацярпела і падлягае суцэльным санітарным высечкам больш за 21 тысячу гектараў лясных насаджэнняў па ўсёй краіне: «Сёння спецыялісты ўжо абследавалі гэтыя ўчасткі і мы вызначылі, што на 14 тысячах гектараў неабходна стварыць лясныя культуры, астатнія плошчы па сваіх умовах будуць пакінуты пад натуральнае зарошчванне. На гэтую восень у нас запланавана стварыць 4300 гектараў лясных культур. У рамках акцыі аднаўляем насаджэнні, якія загінулі ў выніку ліпеньскага ўрагану. Старт акцыі даў асабіста кіраўнік дзяржавы».

Па папярэдніх падліках у акцыі ўзялі ўдзел каля 30 тысяч чалавек па ўсёй краіне. «Сёння да акцыі далучыўся дэпутацкі корпус на чале з Ігарам Пятровічам. Удзел у мерапрыемстве бяруць усе вышэйшыя службовыя асобы, органы ўлады, органы дзяржаўнага кіравання, грамадскія арганізацыі. Адгукнуліся ўсе: ад малога да вялікага. Мы прапануем не толькі пасадзіць лес, але і прыбраць галінкі, пасечаныя рэшткі. Усе з задавальненнем адгукаюцца на наш заклік, і мы ўдзячныя за водгук насельніцтва», — дадаў Аляксандр Драгун.

На Крупшчыне ёсць участак, які быў пашкоджаны ў выніку ліпеньскага ўрагану. «Мы вырашылі раўнамерна ахапіць усю краіну, у тым ліку тыя ўчасткі, якія патрабуюць асаблівай увагі з пункту гледжання лесааднаўлення. Гэты ўчастак быў пашкоджаны. Ён ужо высечаны, ачышчаны. І сёння мы створым тут лясныя культуры, высадзім дзясяткі тысяч новых дрэў, якія праз некалькі дзесяцігоддзяў цалкам заменяць загінулыя насаджэнні», — заўважыў першы намеснік міністра лясной гаспадаркі.

На гэтай тэрыторыі парламентарыі высадзілі лясныя культуры хвоі (70 працэнтаў) і елкі (30 працэнтаў). «Адпаведна, тут хутка будуць іглічныя насаджэнні. Пасля пасадкі дрэў нашы спецыялісты праводзяць тэхнічную прыёмку работ, ацэньваюць, наколькі прыжыліся лясныя расліны. Гэта сапраўды карпатлівая праца, а вырошчваць лес — складана і адказна. Нашы спецыялісты яго пастаянна абследуюць і на месцы загінулых раслін высаджваюць новыя. Гэта мерапрыемства па дапаўненні лясных культур. Затым мы даглядаем дрэвы. Наша мэта лесавырошчвання — зрабіць так, каб праз сем гадоў тут сфарміравалася насаджэнне і мы перавялі яго ў лесапакрытую плошчу», — падсумаваў Аляксандр Драгун.

«ЛЕС І ЗЕЛЯНІНА — НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГОНАР»

Калі робіш справу з душой, з любоўю, гэта вельмі проста. Такім меркаваннем падзяліўся з журналістамі **намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па экалогіі і прыродакарыстанні Палаты прадстаўнікоў Алег ЦЫЛЬКО.** «Для Беларусі лес і зеляніна — наш нацыянальны гонар. І тое, што ў нашай краіне на добрай аснове пастаўлена правядзенне такіх акцый па аднаўленні лясных угоддзяў — сапраўды вельмі важна. Прыклад нам паказаў Прэзідэнт, які даў старт гэтай акцыі. У ёй удзельнічаюць не толькі вышэйшыя службовыя асобы, але і навучальныя ўстановы, прадпрыемствы, звычайныя грамадзяне, якім неабыякавая прыгажосць нашай краіны. А калі робіш справу з душой, з любоўю, гэта вельмі проста».

Такім чынам, годна справіўшыся з задачай, народныя выбраннікі зрабілі нашу краіну прыгажэйшай, падарыўшы лесу новае жыццё.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ.
Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.
Крупскі раён.

ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

У Кітаі заявілі аб перамозе Пуціна

Насуперак чаканням улад ЗША санкцыі не здолелі сцерці эканоміку Расіі, а прэзідэнт Уладзімір Пуцін атрымаў перамогу, згуртаваўшы вакол краіны мноства прыхільнікаў новай фінансавай сістэмы і справядлівага светапарадку. Аб гэтым піша кітайская газета South China Morning Post, паведаміла РІА «Новости». «Хуткая рэструктурызацыя і ўздым эканомікі краіны — насамрэч неверагодная з'ява... Яны (заходнія палітыкі. — **Рэд.**) пераконвалі сябе ў тым, што Расія — гэта калос на гліняных нагах... Насамрэч усё адбылося з дакладнасцю ды наадварот», — адзначаецца ў матэрыяле. Расія вытрымала ўдар, нанесены амерыканскімі санкцыямі. Гэтыя меры супраць Масквы толькі насцярожылі іншыя краіны і паказалі, чым можа абярнуцца «незадаволенасць» з боку Вашынгтона і Бруселя. Такім чынам, Уладзімір Пуцін здабыў мноства ўтоеных саюзнікаў, якія падзяляюць ідэю новага светапарадку, — ад Індыі да арабскіх дзяржаў, ад Афрыкі да шматлікіх краін Цэнтральнай Азіі, выказаў упэўненасць аўтар. «Хваленае адзінства Захаду разваліваецца на вачах», — канстатаваў ён. У якасці прыкладу таго, што Захаду не ўдалося ператварыць Расію ў ізгой, аўтар прывёў саміт БРІКС, што прайшоў у Казані, які наведалі дэлегацыі з 32 краін.

Грузінская апазіцыя спрабуе падняць пратэсныя настроі ў краіне

Старшыня ЦВК Грузіі Георгій Каландарышвілі паведаміў, што перамогу на парламенцкіх выбарах атрымала кіруючая партыя «Грузінская мара — Дэмакратычная Грузія», якая заручылася падтрымкай больш чым 54 працэнтаў выбаршчыкаў. Цяпер апазіцыя будзе займаць 61 месца са 150 у парламенце, у той час як кіруючая партыя будзе мець 89 месцаў — большасць, але недастатковая для таго, каб правесці жаданыя ёю канстытуцыйныя змены. Чатыры апазіцыйныя групы адмовіліся прызнаць вынікі выбараў. Празаходні прэзідэнт Грузіі Саламэ Зурабішвілі, акружаная лідарамі апазіцыі, заявіла аб «фальсіфікацыі» галасавання. Выканаўчы сакратар партыі «Грузінская мара — Дэмакратычная Грузія» Мамука Мдынарадзэ заявіў, што апазіцыя спрабуе з нуля падняць пратэсныя настроі ў краіне, паведаміла ТАСС. Прэм'ер-міністр Грузіі Іраклій Кабахідзэ заявіў аб пераканаўчых выніках выбараў у краіне, а таксама адхіліў абвінавачанні ў фальсіфікацыі вынікаў галасавання.

Кіруючая кааліцыя Японіі страціла большасць у ніжняй палаце парламента

Кіруючая кааліцыя Японіі, якая складаецца з Ліберальна-дэмакратычнай партыі (ЛДП) і партыі «Камэйта», страціла большасць у ніжняй палаце парламента, якую яны захоўвалі з 2012 года. Аб гэтым сведчаць вынікі выбараў, што прайшлі ў краіне, паведаміў тэлеканал NHK. «Пакуль вынікі (выбараў) няпростыя», — пракаментаваў прэм'ер-міністр Сігэру Ісіба. Як адзначае агенцтва «Кіёда», прэм'ер выказаў гатоўнасць сфарміраваць урад на чале з ЛДП, але зараз яму «давядзецца шукаць дадатковую падтрымку па-за кааліцыяй, каб мець стабільны ўрад». Агенцтва звяртае ўвагу на агульную нявызначанасць перспектывы развіцця падзей пасля выбараў, паколькі «некаторыя буйныя апазіцыйныя партыі, якія дабіліся прыкметных поспехаў, адхілілі магчымасць далучэння да ўрада».

Тут пачынаецца будучыня

ВІЗІТКА РЭГІЁНА

«Барысаў-Арэна» — галоўная славутасць не толькі дадзенага райцэнтра, але і ўсяго цэнтральнага рэгіёна. Стадыён уразіў усіх сваёй незвычайнай архітэктурай. «Барысаў-Арэна» — гэта самы сучасны, шматфункцыянальны футбольны стадыён у Беларусі, які з'яўляецца дамашняй арэнай футбольнага клуба БАТЭ. Яго будаўніцтва пачалося ў лістападзе 2010 года. Сучаснае абсталяванне «Барысаў-Арэны» адпавядае ўсім міжнародным нормам і стандартам. Стадыён можа прымаць не толькі паядынкі кваліфікацыйных стадый еўракубкаў, але і сустрэчы Лігі чэмпіёнаў і Лігі Еўропы, аж да паўфіналаў. Афіцыйнае адкрыццё стадыёна адбылося 3 мая 2014 года фінальным матчам розыгрышу Кубка Беларусі паміж гродзенскім «Нёманам» і салігорскім «Шахцёрам».

За час свайго існавання «Барысаў-Арэна» стала візіткай рэгіёна і карыстаецца попытам у барысаўчан. А сёлета на яе базе пачата ўзвядзенне лыжа-ролернай трасы, што яшчэ больш надасць папулярнасць гэтай установе.

НА ПАРАДКУ ДНЯ — САЦЫЯЛЬНАЯ СФЕРА

Начальнік галоўнага ўпраўлення ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінскага аблвыканкама Вольга ТОПДЭМІР што гадаваць дзяцей — гэта жаночая справа. Мужчына — здабытчык, а жанчына павінна быць каля ачага. Так складвалася тысячагоддзямі. Але сёння жыццёвыя ўмовы мяняюцца, мы развіваемся, ідзём наперад. І сёння кожны мае права сам рабіць свой выбар. Калі жанчына, дапусцім, зарабляе больш, то ў сям'і могуць прыняць рашэнне аб сыходзе ў дэкрэтны адпачынак менавіта мужчыны. Гэта сур'ёзнае рашэнне, бо даглядаць дзіця — такая ж праца, а дзесьці, можа, і больш складаная».

Асаблівую ўвагу аддалі пытанню аб сем'ях, якія прыбылі пад абарону нашай краіны з Украіны і іншых гарачых кропак. «Ужо дзевяць сем'яў працаўладкавалі ў нас, у Мінскай вобласці, — удакладніла **старшыня камітэта па працы, занятасці і сацыяльнай абароне Мінскага аблвыканкама Тамара КРАСОЎСКАЯ.** — Яны звярнуліся да нас ва ўпраўленне працы і атрымалі накіраванне. Усе сем'і знайшлі сваё месца. Вядома, я хачу сказаць, што вялікую колькасць прынялі такія раёны, як Дзяржынскі, Барысаўскі і іншыя. І гэтыя сем'і вельмі ўдзячныя за тое, што ім наша краіна дала дом, магчымасць жыць тут шчасліва. У тэрытарыяльныя цэнтры прыбылі ўкраінскія сем'і, якія сталі ў нас на ўлік, атрымліваюць сацыяльныя паслугі, у тым ліку і шматдзетныя сем'і, якія атрымліваюць у тым ліку і істотную дзяржаўную падтрымку, прымаюць рашэнне ўвесці нейкі адзіны элемент. Гэта ўжо ідзе на ўзроўні абмеркавання ўстановы адукацыі. Калі ўсе гатовыя, мы падтрымліваем іх ініцыятыву.

Пра ролю Беларускай праваслаўнай царквы ў пытаннях сямейнага выхавання і прывіцці традыцыйных сямейных каштоўнасцяў распавёў журналістам **епіскап Барысаўскі і Мар'інагорскі Амвросій:** «Царква — гэта малая сям'я. А сям'я — гэта малая царква. Таму для царквы вельмі важны інстытут сям'і. І тое, што цяпер адбываецца на Захадзе, гэта, сапраўды, яго разбурэнне. Таму царква разам з дзяржавай імкнецца да таго, каб гэтыя традыцыйныя сямейныя каштоўнасці ў нашым грамадстве захоўваліся. Найперш асабістым прыкладам. Напрыклад, у нашай епархіі шмат святароў, якія з'яўляюцца шматдзетнымі. У аднаго з іх сёлета нарадзілася 11-е дзіця! Вельмі важна, калі ў сям'і шмат дзяцей. У сям'і яны атрымліваюць навык камунікацыі, вучацца выбудоўваць узаемаадносіны са старэйшымі».

З ДОБРАЙ ДУШОЙ

Тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Барысаўскага раёна — адзін з самых вялікіх у нашай краіне. У яго складзе шэсць аддзяленняў. Цэнтр з'яўляецца пераможцам у дзвюх намінацыях рэспубліканскага конкурсу «105 ідэй для развіцця

галіны», пераможцам рэспубліканскага конкурсу «Святло міласэрнасці», неаднаразова прызнаваўся прызёрам па выніках работы цэнтраў Мінскай вобласці.

У Барысаўскім ТЦСАН журналісты пабывалі на шасці лакацыях, дзе ім прадэманстравалі сучасныя і эфектыўныя формы работы па сацыялізацыі інвалідаў. Вопыт насамрэч унікальны. Тут акумулююцца і рэалізоўваюцца ўсе перспектыўныя кірункі. У цэнтры найлепшая футбольная каманда вобласці, якую трэніруюць інваліды, працуе тактыльны музей, а валанцёры пастаянна суправаджаюць невідушчых.

— Штатная колькасць складае амаль 400 чалавек. І асноўная работа нацэлена на пажылых і інвалідаў, — распавяла **дырэктар Тэрытарыяльнага цэнтра сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Барысаўскага раёна Вольга КАПЫТОК.** — Людзі з добрай душой тут з адной мэтай — знайсці для сябе нешта новае. Восем гурткоў, дзе займаюцца штодня. Ёсць і ўніверсітэт трэцяга ўзросту. Тут тры факультэты: фінансавая адукацыя, псіхалогія і англійская мова. У гуртках людзі могуць таксама навучацца ёзе, скандынаўскай хадзе, фізічнай культуры ў адпаведнасці з узростам. Працуюць і валанцёрскія клубы. Навучаем карыстацца камп'ютарам і мабільнікам пажылых людзей. Яны сталі на ўзровень вышэй у сацыяльным абслугоўванні, маюць зносіны з дзецьмі, унукамі, сваякамі, якія жывуць у іншай краіне, па відэасувязі. Такім чынам, чалавек не адчувае сябе адзінокім.

«БАЛЬНІЦА, ДОБРАЗЫЧЛІВАЯ ДА ДЗІЦЯЦІ»

Барысаўскі радзільны дом з'яўляецца міжраённым перынатальным цэнтрам. Тут атрымліваюць лячэбна-кансультатыўную дапамогу пацыенты з Барысаўскага, Бярэзінскага, Крупскага, Смалявіцкага раёнаў і горада Жодзіна.

Радзільны дом мае званне «бальніца, добразычлівая да дзіцяці» з канца 1990-х гадоў і пастаянна яго пацвярджае. І робіцца гэта на міжнародным узроўні — званне прысвойвае СААЗ. Дарэчы, барысаўчане былі аднымі з першых у нашай краіне, хто атрымаў такое ганаровае званне.

«Укаранёны і паспяхова функцыянуюць тэхналогіі догляду немаўлят, — кажа **галоўны ўрач Барысаўскага радзільнага дома Вольга КАНАШЭЎСКАЯ.** — Спосабам выходжвання неданошаных дзяцей з'яўляецца «Метад кенгуру», пры якім адбываецца кантакт малога і маці. Гэта дазваляе немаўлятам хутчэй адаптавацца да навакольнага свету, лепш развівацца і набіраць вагу. Для аказання экстраннай і неадкладнай дапамогі ў аддзяленні нованароджаных арганізавана палата інтэнсіўнай тэрапіі на шэсць ложкаў. Па ініцыятыве Дзіцячага фонду ААН (ЮНІСЕФ) з 2018 года функцыянуе пакой прафілактыкі дзіцячага траўматызму».

У аддзяленні анестэзіялогіі і рэанімацыі для нованароджаных дзяцей укаранёны тэхналогіі, якія дазваляюць захаваць жыццё самых маленькіх пацыентаў у крытычных сітуацыях, у тым ліку дзяцей, якія нарадзіліся з масай цела да кілаграма.

Пазнаёміліся з маладой мамай Веранікай. Яна распавяла, як яе прынялі ў радзільным доме: «Мы з дачкой знаходзімся ў асобнай палаце, вельмі рада, што тут ёсць такая магчымасць, — дзеліцца барысаўчанка. — Прыемным бонусам гэтай палаты стала і тое, што сюды могуць прыходзіць сваякі. Учора наш тата не мог дачакацца і прыйшоў нас адведаць, упершыню сустрэўся з дачкой. Патрымаў на ручках нашу малую, зэяў ад шчасця! Дачку назвалі Ясенія. Я ўпершыню стала мамай, гэта вельмі доўгачаканая падзея ў нашай сям'і. Было вельмі хвалюючa. Умовы і персанал у радзільні выдатныя. Дапамагаюць, паказваюць, распавядаюць... У мяне былі натуральныя і хуткія роды. Усё прайшло добра. Персаналу вялікі дзякуй!»

ТРАДЫЦЫЙНЫЯ КАШТОЎНАСЦІ

Сярэдняя школа № 24 Барысава мае цесныя ўзаемаадносіны з Беларускай праваслаўнай царквой. Тут пазнаёміліся з вопытам духоўна-маральнага выхавання школьнікаў, фарміравання ў іх традыцыйных сямейных каштоўнасцяў. Ва ўстанове адукацыі навучаецца 40 класаў (884 вучні), у тым ліку сем класаў, у якіх рэалізоўваецца праграма спецыяльнай адукацыі.

«Наша школа адметная і вядомая ў Мінскай вобласці, у першую чаргу, як цэнтр па духоўна-маральным і сямейным выхаванні, — распавяла **дырэктар сярэдняй школы № 24 горада Барысава Таццяна ПРАКАПЕНКАВА.** — І гэта, вядома, вялікая дапамога ўсім нашым педагогам, дзецям і бацькам. Вядома, сям'я — гэта тое месца, дзе пачынае фарміравацца дзіця. Але ад таго, як гэта падхопіць школа, таксама многае залежыць. Таму ў школе, акрамя таго што выкарыстоўваюцца факультатыўныя заняткі «Асновы праваслаўнай культуры», «Асновы духоўнасці, маральнасці і патрыятызму» (для вучняў 5—7 класаў), таксама выкладаюцца дадатковыя паслугі, праводзяцца факультатыўныя заняткі музычна-эстэтычнай, харэаграфічнай накіраванасці. Ёсць інструментальны аркестр. Выбар рэпертуару, тых песень, з якімі музыканты выступаюць, таксама накіраваны на тое, каб несці духоўнасць».

Завяршыўся прэс-тур закладкай алеі бацькоўскай любові каля Палаца культуры. Пасадзіўшы туі, журналісты зрабілі горад крыху зялянейшым і пакінулі пра сябе добры ўспамін, які, безумоўна, застанецца на доўгія часы.

Данііл ХМЯЛЬНІЦКІ, фота аўтара.

г. Барысаў.

адзначыла, што Міншчына багатая на дасягненні. «Шмат робіцца з боку дзяржавы для падтрымкі сям'і і для таго, каб нашы грамадзяне адчувалі сябе камфортна і ўтульна! І невыпадкова мы выбралі горад Барысаў і Барысаўскі раён. Гэта адзін з паказальных рэгіёнаў ва ўсіх адносінах. Нягледзячы на тое, што Барысаў — буйны прамысловы цэнтр, тут добра прадстаўлена работа сацыяльнай сферы, выдатная сацыяльная інфраструктура. Тут шмат робіцца ў плане прасоўвання духоўна-маральных каштоўнасцяў».

На прэс-канферэнцыі было ўзнята цікавае пытанне аб бацькоўстве. Даведаліся, ці можа бацька сысці ў дэкрэтны адпачынак. «У Барысаўскім рэгіёне 22 мужчыны знаходзяцца ў дэкрэтным адпачынку па доглядзе дзіцяці да трох гадоў, — распавёў **старшыня Барысаўскага райвыканкама Мікалай КАРПОВІЧ.** — І нашы мужчыны з задавальненнем ідуць. Мы яшчэ з савецкіх часоў прывыклі, прадугледжаную заканадаўствам. Многія атрымалі не толькі статус бежанцаў, але і від на жыхарства ў Беларусі і карыстаюцца такімі ж ільготамі, як нашы сем'і».

Адзіная школьная форма стала неад'емным атрыбутам беларускага вучня. Але ці плануецца ўвядзенне спецформы для педагогаў? На гэтае пытанне дала адказ **першы намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення па адукацыі Мінскага аблвыканкама Соф'я ФІЛІСТОВІЧ:** «У кожнай установе адукацыі вызначаны фармат дзелавога стылю адзення для вучняў. Вызначана і колеравая гама, і элементы школьнага адзення (камізэлька альбо гальштук ці нешта іншае). Гэта вызначаецца пасля абмеркавання з бацькамі, з вучнямі».

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па яе словах, не ставіцца задача, каб усе педагогі мелі адзіны стыль, адзіную форму: «Вядома, ёсць пэўны дрэс-код. Аднак маецца такая практыка ва ўстановах адукацыі, калі, абмеркаваўшы на педагагічным савеце, на пасяджэнні працоўнага калектыву, адміністрацыя, педагагічны калектыў

Извещение о повторном открытом аукционе по продаже незавершенного строительством жилого дома и права аренды земельного участка в г. Гродно 19 ноября 2024 года

№ лота	Местонахождение земельного участка, его кадастровый номер	площадь земельного участка, га	Характеристика (описание) не завершенного строительством капитального строения	Ориентировочные расходы по подготовке документации для проведения аукциона, руб.	Начальная цена предмета аукциона (в том числе: начальная цена не завершенного строительством капитального строения; права аренды земельного участка), руб.	Сумма задатка, руб.
1	Гродненская область, г. Гродно, ул. Сергея Болгарина, 6А (У-605, микрорайон «Заболоть») 440100000002007241	0,0950	Не завершенное незаконсервированное капитальное строение, готовность 31%. Надземных этажей: 1; наружная площадь: 203 кв. м; фундамент: железобетон; наружные, внутренние стены: газосиликатный блок	391,44	33 481,33 (30 144,45; 3 336,88)	3 300,00

Земельный участок предоставляется в аренду сроком на 50 лет (с момента государственной регистрации права) для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома. Инженерные коммуникации на участке могут отсутствовать. Возможность подключения к внеплощадочным сетям водоснабжения, газоснабжения, электроснабжения и пр., и точки подключения определяются проектом. Земельный участок может иметь ограничения и обременения. Назначение земельного участка в соответствии с единой классификацией назначения объектов недвижимого имущества: земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме).

Условия, предусмотренные в решении о формировании земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона: внесение платы за предмет аукциона и возмещение затрат на организацию и проведение аукциона, в том числе расходов, связанных с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения в течение 10 рабочих дней; обращение за государственной регистрацией прав на земельный участок в РУП «Гродненское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру» в двухмесячный срок со дня подписания договора аренды земельного участка; продолжить строительство жилого дома в соответствующий решению срок. Победитель аукциона обязан в течение срока строительства возместить затраты в соответствии с постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 01.04.2014 г. № 298 и решением Гродненского горисполкома от 12.04.2022 г. № 260

Организатор аукциона: коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», тел.: 8 (152) 626055, 626056.

Для участия в аукционе необходимо: внести задаток на расчетный счет BY24 AKBB 3012 0000 4181 0400 0000 Гродненское областное управление №400 ОАО АСБ «Беларусбанк», г. Гродно, БИК AKBBBY2X, код назначения платежа 40901, УНП 590727594 получатель – коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости», задаток вносится в белорусских рублях в сумме согласно настоящему извещению; представить в коммунальное унитарное предприятие по оказанию услуг «Гродненский центр недвижимости» следующие документы: гражданином – копию документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования; индивидуальным предпринимателем – копию свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования; представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – доверенность, оформленную в соответствии с требованиями законодательства; представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданную юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица; представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления об участии в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык. Документы, составленные за пределами Республики Беларусь в соответствии с законодательством иностранного государства, должны быть легализованы, если иное не предусмотрено законодательством. Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

Аукцион состоится 19 ноября 2024 года в 12.00 по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1 (актовый зал). Прием документов осуществляется по адресу: г. Гродно, пл. Ленина, 2/1, кабинет № 117 с 5 ноября по 14 ноября 2024 года включительно в рабочие дни с 08:00 до 13:00 и с 14:00 до 17:00.

Аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи, не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач с публичных торгов, утвержденным постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 23.03.2018 г. № 220. Аукцион проводится аукционистом при наличии двух или более участников аукциона. Аукцион продолжается до тех пор, пока по новой объявленной аукционистом цене аукционный номер не поднимет только один участник аукциона. Аукционист называет аукционный номер этого участника, трижды последнюю цену и объявляет о продаже предмета аукциона, а участника аукциона – победителем аукциона в отношении соответствующего предмета аукциона. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов. Победитель торгов либо единственный участник несостоявшегося аукциона, выразивший согласие на приобретение земельного участка, как единственный, подавший заявление на участие в аукционе, в течение 10 рабочих дней со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо признания аукциона несостоявшимся обязан: внести плату за право аренды земельного участка; возместить организатору аукциона затраты на организацию и проведение аукциона, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения (информация о данных затратах, порядке их возмещения доводится до сведения участников аукциона до его начала при заключительной регистрации под роспись); выполнить условия, предусмотренные в решении об изъятии земельного участка для проведения аукциона и предоставлении его в аренду победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона. Осмотр земельного участка на местности производится желающими самостоятельно в удобное для них время.

ИЗВЕЩЕНИЕ о проведении повторного аукциона

Государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации» (Организатор аукциона) по поручению ОАО «Вилейский комбикормовый завод» (Продавец), проводит открытый аукцион по продаже **свиноводческого комплекса «Брусы»** (составные части и принадлежности: сети водоснабжения, сети канализации, сети электроснабжения, покрытие (3 шт.), ограждения (3 шт.), дезбарьер (2 шт.), столовая, весовая по отгрузке свиней, мастерские – столярный цех, здание мазутонасосного хозяйства, хрячник, племферма, КНС № 4, цех убоя свиней, центральная весовая, корпус № 10, корпус № 9, КНС № 3, корпус № 8, корпус № 7, корпус № 6, КНС № 1, корпус № 5, корпус № 4, корпус № 3, КНС № 2, корпус № 2, корпус № 1, склад № 1, склад № 2, склад № 3, склад № 4, склад комбикормов, АЗС, административное здание, склад и оборудование (шахта вытяжная вентиляции D650мм (инв. № 62), система кормления свиней (2 бункера для хранения и подачи кормов) (инв. № 167), система кормления свиней (2 бункера) (инв. № 86), станок для свиноматки (инв. № 290), кормушка для свиноматки (инв. № 76), станок для свиноматки (инв. № 72), станок для свиноматки (инв. № 78), система автоматического кормления свиней (инв. № 70), кормушка для свиней (инв. № 296), кормушка для свиней (инв. № 74), система кормораздачи, кормления и водопоения (инв. № 9), система навозоудаления (инв. № 26), система навозоудаления (инв. № 67), мотор-редуктор приводной станции (инв. № 1245), мотор-редуктор приводной станции СМ 075 FS 40 90 B5 M1 1.50 kw (инв. № 1421), кормушка для поросят (инв. № 68), кормовой аппарат ящичного типа для откорма (инв. № 720), кормовой аппарат ящичного типа для откорма (инв. № 721), кормовой аппарат ящичного типа для откорма (инв. № 722), кормопровод для раздачи кормов (инв. № 286), система кормораздачи и кормления (инв. № 288), кормушка для свиней (инв. № 175), система кормораздачи и кормления свиней (инв. № 291), кормовой аппарат для свиней (инв. № 87), решетка напольная (инв. № 66), ограждение из ПВХ для свиней (инв. № 169), опора решетки для свиней (инв. № 287), сдвоенный кормовой аппарат (инв. № 292), сдвоенный кормовой аппарат (инв. № 73), вентиляторы ВО 5,6-А370/6Д-1 (инв. № 685328), вентиляторы ВО 5,6-А370/6Д-3 (инв. № 685330), вентиляторы ВО 5,6-А370/6Д-2 (инв. № 685329), вентиляторы ВСБ-4.0 с электродвигателем (инв. № 133), вентиляторы ВСБ-4.0 с электродвигателем (инв. № 134), вентиляторы ВСБ-4.0 с электродвигателем (инв. № 135), система вентиляции: 4 вентилятора ВО 5,6-А370/6Д (инв. № 1742), система вентиляции: вентиляторы ВО 5,6-А370/6Д (инв. № 1570), бункер из стекловолокна для хранения и подачи комбикорма (инв. № 89), бункер из стекловолокна для хранения и подачи комбикорма (инв. № 284), теплогенератор (инв. № 246), теплогенератор (инв. № 247), кран-балка (инв. № 507), электроталь (инв. № 122), котел паровой КВ-300 (инв. № 36), котел паровой КВ-300 (инв. № 204), стрелка переводная 1П-2 (инв. № 965), теплогенератор (инв. № 244), холодильная камера низкотемпературная (инв. № 492), холодильный агрегат на базе герметичного компрессора (инв. № 491), насос жидкостный НЖН-200А (инв. № 203), насос жидкостный НЖН-200 с двигателем 22\1000 (инв. № 206), насос центробежный ННФ 00.010 СБ (инв. № 208), насос центробежный ННФ 00.10 СБ (инв. № 209), насос центробежный ННФ 00.010 СБ (инв. № 207), насос жидкостный НЖН с электродвигателем (инв. № 253), котел водонагревательный КСВ-0,09 (инв. № 1200), насос центробежный ННФ 00.10 СБ (инв. № 210), чан шпарильный со скребмашиной ПМ-ФЧШ-С2ПЦ (инв. № 301), система дезинфекции автотранспорта на КПП (инв. № 258), теплогенератор-2000 (инв. № 69), таль электрическая РА-500 (инв. № 501), шнек для кормораздачи (инв. № 701), шнек для кормораздачи (инв. № 703), бункер из стеклопластика (3,6 т) (инв. № 700), бункер из стеклопластика (3,6 т) (инв. № 702), весы электронные монорельсовые на 500 кг (инв. № 8965), система теплых полов (инв. № 82), секция нагревательная кабельная 20 ТЛОЭ2 на 2 станка (инв. № 293), секция нагревательная кабельная 15 ТЛОЭ2 на 1 станок (инв. № 294), комплект весового оборудования (весовая), расположенного на земельном участке площадью 27,9131 га с кадастровым номером 624084000001000005 (право постоянного пользования, ограничение в использовании – охранная зона линий электропередачи, пл. 2,2100 га) по адресу: Минская область, Мядельский район, Сватковский с/с, 8, вблизи д. Брусы.

Начальная цена с НДС (20%) – 2 896 501,68 бел. руб. (задаток 10% от начальной цены – 289 650,00 бел. руб.). Стоимость снижена на 10%.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, код платежа – 40901, код категории платежа OTHR, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации». Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 30 (тридцати) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи. Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает Организатору аукциона вознаграждение за организацию и проведение торгов, включающее затраты на организацию и проведение результативного аукциона, в размере 2 (двух) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает затраты на публикацию в СМИ. Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов: www.rlt.by. Предыдущее извещение было опубликовано в газете «Звязда» от 08.08.2024.

Аукцион состоится 12.11.2024 г. в 12.00 по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по 11.11.2024 г. до 17.00 по указанному адресу в каб. 320. Тел: 8(017) 516-80-65, 516-80-64, 8(029) 102-21-17, 8(029) 136 31 11. Тел. для осмотра 8(044) 733-04-55.

УНП 600010651

Открытое акционерное общество «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс» (Республика Беларусь, 246008, г. Гомель, ул. Лещинская, 49) сообщает, что внеочередным общим собранием акционеров данного общества, состоявшимся 25.10.2024 г., принято решение о выплате дивидендов за девять месяцев 2024 года – 0 рублей 86 копеек на одну простую (обыкновенную) акцию.

Выплата дивидендов по акциям будет производиться с 28.10.2024 г. по 31.12.2024 г.

Порядок выплаты дивидендов акционерам: юридическим лицам – путем зачисления на их расчетные счета, физическим лицам дивиденды зачисляются на их карточные счета либо выплачиваются через кассу ОАО «Гомельская мебельная фабрика «Прогресс», или высылаются почтовым переводом (в пределах Республики Беларусь).

УНП 400078768

Извещение о проведении аукциона

Организатор аукциона: ООО «ИПМ-Консалт оценка», 220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1

Продавец: ОАО «АГАТ-стройсервис», 231103, Гродненская область, г. Ошмяны, ул. Советская, 173

№ лот	Инв. номер	Предмет аукциона	Начальная цена с НДС 20%, бел.руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
Оборудование (б/у), расположенное по адресу: Гродненская область, г. Ошмяны, ул. Советская, 173				
1.		Оборудование и строительный инструмент, реализуемый одним лотом, в количестве 32 ед. **Подробный перечень размещен на сайте организатора аукциона: www.ipmtorgi.by**	13087,20	654,36
2.		Имущество, реализуемое одним лотом: холодильник Атлант Х-1401-100, XEROX 3100 MFPV S (инв. номер 000000091), персональный компьютер «Сильверадо» (инв. номер 000000076)	332,40	16,62
3.	000000087	Бензорез STIHL TS 400	1320,00	66,00
4.	000000102	Вагон-бытовка	1920,00	96,00
5.		Имущество, реализуемое одним лотом: виброплита (инв. номер 000000077), виброплита BIM CP 068 D (инв. номер 000000110)	1752,00	87,60
6.	000000055	Емкость для ГСМ (5 м3)	732,00	36,60
7.	000000096	Ленточнопильный станок МВ-2000	5880,00	294,00
8.		Имущество, реализуемое одним лотом: опалубка ж/б кольца 1м (инв. номер 000000044), опалубка ж/б кольца 2м (инв. номер 000000093)	1236,00	61,80
9.	000000043	Пилорама Р-634Б	40920,00	2046,00
10.		Имущество, реализуемое одним лотом: Полуавтомат сварочный Solaris TOPMIG-226 (инв. номер 000000112), сварочный аппарат Minax-150 (инв.номер 000000072), инвертор сварочный SOLARIS	1560,00	78,00
11.		Имущество, реализуемое одним лотом: станок деревообрабатывающий (инв. номер 000000015), станок деревообрабатывающий ШД (инв. номер 000000102)	852,00	42,60
12.	000000075	Станок прирезной многопильный	3840,00	192,00
13.	000000014	Станок рейсмусовый ЦКБ-40-1	4320,00	216,00
14.	000000040	Станок фрезерный ФСШ-1	2640,00	132,00
15.	000000050	Станок строгально-фуговальный	1440,00	72,00
16.	000000051	Станок строгальный БДС-4	1104,00	55,20
17.	000000054	Четырехсторонний строгальный станок С2Б-12	3360,00	168,00
18.	000000074	Штукатурная станция	2280,00	114,00
19.	000000052	Долбежный станок	792,00	39,60
Транспортные средства и спецтехника (б/у), расположенная по адресу: Гродненская область, г. Ошмяны, ул. Советская, 173				
20.	000000079	Микроавтобус вагон (wagon) ГАЗ-322132, 2005 г.в., рег. знак АВ 3564-4	2880,00	144,00
21.	000000105	Легковой седан (sedan) VAZ-2107, 1991 г. в., рег. знак 3350 МР-4	1080,00	54,00
22.	000000078	Легковой вагон FORD TRANSIT, 1995 г.в., рег. знак 5624 ЕТ-4	4080,00	204,00
23.	000000089	Прицеп MAZ 857100-(010), 2010 г.в., рег. знак 4444 АА-4	6960,00	348,00
24.	000000073	Трактор Беларус-892, 2009 г. в., рег. знак СВ-4 1384	23280,00	1164,00
25.	000000170	Тракторный прицеп	5880,00	294,00
26.	000000022	Тракторный прицеп 1,7 т	456,00	22,80
27.	000000020	Прицеп 2ПТС-4, 1988 г. в., рег. знак СВ-4 1902	2880,00	144,00
28.	000000026	Тракторный прицеп железный ПТС-6	6720,00	336,00
29.	000000021	Тракторный прицеп лесовоз ПТС-9	3000,00	150,00
30.	000000113	Автомобиль грузовой бортовой FORD TRANSIT, 1993 г. в., рег. знак АМ 9370-4	10200,00	510,00

Дата, место и время проведения аукциона	**29.11.2024 г.** в 13.00 по адресу: **220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, ООО «ИПМ-Консалт оценка».**
Дата, место и время окончания приема документов	**28.11.2024 г.** до 17.00 по адресу: **220004, г. Минск, ул. Немига, д. 40, пом. 46, оф. 1, ООО «ИПМ-Консалт оценка».**

Порядок ознакомления: осуществляется в рабочие дни с 8.00 до 17.00. Ответственное лицо: Совринович Алексей Генрихович, тел. +375(44)-767-78-80.

С подробной информацией по предмету аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона: www.ipmtorgi.by, www.cpo.by

Задаток 10% от начальной цены предмета аукциона в белорусских рублях перечисляется на р/с BY92BELB30120048350080226000 в ОАО «Банк БелВЭБ», г. Минск, ул. Мясникова, 32; БИК BELBBY2X; УНП 191224638; ОКПО 378531865000, получатель платежа ООО «ИПМ-Консалт оценка».

Срок подписания договора купли-продажи: 10 (десять) рабочих дней после проведения аукциона.

Срок оплаты: не более 10 (десяти) рабочих дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Порядок оформления участия в аукционе и результатов торгов: аукцион проводится в соответствии с Положением о порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов, утвержденным постановлением СовМина РБ от 8 января 2013 г. № 16 «О некоторых вопросах продажи имущества ликвидируемого юридического лица». К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору аукциона в указанный в извещении срок заявление с приложением всех необходимых документов, зарегистрированное в журнале регистрации заявлений на участие в торгах, и заключившие с организатором торгов договор о задатке. С подробной информацией о перечне предоставляемых документов, образцами заявления на участие в аукционе и договора о задатке, а также правилами проведения аукциона можно ознакомиться на сайте организатора аукциона: **www.ipmtorgi.by**

В случае признания торгов несостоявшимися в связи с тем, что заявление на участие в них было подано только одним участником либо для участия в них явился только один участник, возможна продажа предмета торгов этому участнику по начальной цене, увеличенной на 5 %.

Затраты и вознаграждение (10 % от цены продажи) на организацию и проведение торгов возмещаются организатору аукциона участником торгов, с которым заключается договор купли-продажи в течение 5 дней со дня проведения торгов.

Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время до объявления его проданным без объяснения причин снятия.

Контактные телефоны:	**Тел: +375 (44) 704-92-06, Email: info@ipmtorgi.by**

Сіла думкі

Найлепшыя патэнты

Фінал конкурсу «Найлепшы патэнт Беларусі» ў Нацыянальнай бібліятэцы краіны прайшоў у межах IV Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Інтэлектуальная ўласнасць у сучасным свеце: выклікі часу і перспектывы развіцця». Конкурс у сферы вынаходніцтва з мэтай да кастрычніка праводзілі Дзяржаўны камітэт па навуцы і тэхналогіях Рэспублікі Беларусь і Нацыянальны цэнтр інтэлектуальнай уласнасці сумесна з Еўразійскім патэнтным ведамствам Еўразійскай патэнтнай арганізацыі.

На конкурс «Найлепшы патэнт Беларусі» было пададзена 44 заяўкі, расказаў **старшыня журы, першы намеснік старшыні Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях Дзяніс КАРЖЫЦКІ.** Гэтыя вынаходніцтвы ўяўляюць сабой сучасныя рашэнні ў медыцыне (найбольшая колькасць заявак паступіла менавіта ў сферы аховы здароўя), розных галінах прамысловасці і народнай гаспадаркі. У фінальную частку конкурсу кампетэнтная камісія з ліку прадстаўнікоў ДКНТ, Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, міністэрстваў прамысловасці, аховы здароўя, адукацыі, Асацыяцыі ацэначных арганізацый адабрала 15 наймацнейшых заявак.

Сёння пераможцы названы. «Золата» заваявала супрацьпухлінная фармацэўтычная кампазіцыя і спосаб яе атрымання — інавацыйная распрацоўка ўстановы БДУ «Навукова-даследчы інстытут



фізіка-хімічных праблем». Другое месца атрымала распрацоўка ААТ «Амкадор» — каробка перадач новага пакалення, а трэцяе прысуджана шырокадыяпазоннаму генератару сігналаў, распрацаванаму ў БДУІР.

— Конкурс прымеркаваны да Года якасці, — падкрэсліў Дзяніс Каржыцкі. — Ён закліканы выявіць найлепшыя тэхнічныя і інавацыйныя рашэнні, ужо запатэнтаваныя, якія зарэкамендавалі сябе і зрабілі ўнёсак у эканоміку краіны, іншыя сферы грамадскага жыцця. З пункту гледжання ўзроўню ўдзельнікаў конкурсу гэта айчынныя арганізацыі-лідары ў сваіх галінах.

Распрацоўкі прадстаўлены па самых актуальных праблемах, якія сёння стаяць і ў свеце, і перад нашай краінай, адзначыў старшыня журы конкурсу.

— Усе вынаходніцтвы — сусветнага ўзроўню, — дадаў ён.

Прадстаўленыя на конкурс патэнты скрупулёзна правяраліся экспертамі Нацыянальнага цэнтра інтэлектуальнай уласнасці. Сярод крытэрыяў — сусветная навізна і інавацыйнасць.

— Прафесійныя супольнасці ў сферы інтэлектуальнай уласнасці і Беларусі, і Расіі на працягу многіх гадоў актыўна ўцягнуты ў вырашэнне ключавых на дадзены момант задач: падрыхтоўку кадраў і развіццё рынку інтэлектуальнай уласнасці, — адзначыў **дэкан юрыдычнага факультэта Маскоўскага ўніверсітэта імя А. С. Грыбаедава, доктар юрыдычных навук, прафесар Іван БЛІЗНЕЦ.** — Я рады, што Беларусь адной з першых на еўразійскай патэнтнай прасторы прыняла стратэгію ў галіне інтэлектуальнай уласнасці. У Расіі падобнага дакумента пакуль няма.

Патэнтным структурам дзвюх краін яшчэ шмат трэба зрабіць разам для актывізацыі дзейнасці ў сферы рэгістрацыі патэнтаў, сказаў эксперт. Конкурс «Найлепшы патэнт Беларусі» — крок у намечаным напрамку, бо закліканы вызначыць самыя паспяховыя вынаходкі апошніх гадоў. Але выбраць пераможцаў аказалася няпроста: журы конкурсу прызналася, што перамогі былі вартыя ўсе пятнаццаць фіналістаў.

Інавацыі ў будаўніцтве і ветэрынарыі

Уявіце сабе катэдж... з саломы. Не, не такі, як хатка Нуф-Нуфа, а, наадварот, трывалы і надзейны, пры гэтым лёгкі і экалагічны, ды яшчэ і негаручы. Такі канструкцыйны цеплаізаляцыйны матэрыял для будаўніцтва распрацаваны ў Полацкім дзяржаўным універсітэце.

— Мы атрымліваем яго з адходаў раслінной вытворчасці: саломы, моху, кары і нават баршчэўніка, — распавёў **старшы выкладчык Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (і адзін з аўтараў тэхналогіі) Аляксандр ЯГУБКІН.** Распрацаваў матэрыял ён сумесна з дэканам будаўнічага факультэта Аляксандрам Быкатовічам. — Гэта інавацыйны будаўнічы матэрыял, экалагічна чысты, бяспечны, даўгавечны і негаручы. У нас ёсць усе заключэнні, у тым ліку санітарна-гігіенічная экспертыза і выпрабаванні МНС.

Тэхналогія вытворчасці будаўнічага матэрыялу недарагая, як і сыравіна, запэўніў суразмоўнік. З «раслінных» блокаў (прыродныя матэрыялы звязвае вадкае шкло ці цэмент) будуюцца прыватныя дамы і катэджы — не вышэй за два паверхі. І попыт на іх ёсць.

— Такія дамы ўзводзяць па ўсёй Беларусі. Мы бачым вялікую цікавасць да нашай распрацоўкі, асабліва ў той катэгорыі людзей, для якіх важная экалагічнасць жылля, — расказаў Аляксандр Ягубкін.

Інстытут эксперыментальнай ветэрынарыі імя С. М. Вышалескага прадставіў на конкурс тэст-сістэмы дыягностыкі вірусных інфекцый буйной рагатай жывёлы.

— Патэнт адносіцца да дыягностыкі віруснай дыярэі буйной рагатай жывёлы, але гэта толькі адна з нашых распрацовак, а ўсяго іх больш чым 35, і яны актыўна выкарыстоўваюцца ў практыцы, — кажа **Юрый ЦЯПША, загадчык аддзела малекулярна-генетычнай дыягностыкі і геннай інжынерыі РУП «Інстытут эксперыментальнай ветэрынарыі імя С. М. Вышалескага».**

Дакладны дыягназ тэст-сістэмы даюць магчымасць атрымліваць вельмі хутка — максімум на працягу гадзіны, што дазваляе ў найкарацейшыя тэрміны выбудоўваць стратэгію вакцынацыі і лячэння, каб гаспадаркі маглі пазбегнуць эканамічных страт. Распрацоўка, прапанаваная на конкурс, дастаткова дарагая, растлумачыў вучоны, але вельмі запатрабаваная — толькі на працягу аднаго года яна акупілася ўжо двойчы.

На стэндзе інстытута прадстаўлены таксама шырокі спектр распрацаваных вучонымі вакцын і высокаэфектыўных лекавых ветэрынарных прэпаратаў.

— Працуем і ў іншых кірунках: у прыватнасці, ёсць напрацоўкі ў галіне геннай інжынерыі, за якой будучыня. Напрыклад, гэта атрыманне пратэктыўных бялкоў, якія становяцца асновай для вакцын новага пакалення.

Новыя тэхнічныя рашэнні

«БЕЛАЗ» прадставіў на конкурс патэнт на дыскавы тормаз, які павялічвае эфектыўнасць тармажэння шматтонных гігантаў.

— Распрацоўка ўкаранёна ў вытворчасць, і ўжо атрыманы эканамічны эфект, — адзначае **Павел АНДРЭЙКАВЕЦ, начальнік аддзела арганізацыі інавацыйнай дзейнасці ААТ «БЕЛАЗ».**

Сучасныя пакаленні «белазаў» — гэта газавыя грузавікі, максімальная хуткасць якіх — 60 км/г, а грузападымальнасць — 130 тон. І хоць на кар'еры яны рухаюцца з хуткасцю не больш за 20—25 км/г, спыніць такую махіну вельмі няпроста. Інавацыя дазваляе зрабіць гэта максімальна эфектыўна, забяспечваючы бяспеку і кіроўцы, і працоўных.

«Белазы», дарэчы, за дзесяцігоддзі практычна цалкам змяніўшы «начынне», візуальна змяніліся мала — захоўваюць сваю харызматычную і пазнавальную знешнасць, распавёў суразмоўца. І беларускіх «волатаў» сапраўды пазнаюць па ўсім свеце — сёння «белазы» працуюць у кар'ерах Бразіліі і Венесуэлы, у дзясятках краін Афрыкі і Азіі, а таксама ў шэрагу краін Еўропы.

Гомельскі завод ліцця і нармаляў прадставіў на конкурс распрацоўку «Спосаб уборкі соі».

— Гэта тэхналогія плюс тэхнічныя рашэнні, — растлумачыў **Алег ШЛЯХТО, першы намеснік галоўнага інжынера ААТ «Гомельскі завод ліцця і нармаляў».** — Соя расце вельмі нізка ад зямлі. І каб яе ўбраць, на жатках прымяняюцца рысоры. З-за таго, што жатка ідзе вельмі нізка над зямлёй (а поле ж ніколі не бывае ідэальна роўным), рысоры рухаюцца то ўверх, то ўніз, змяняецца нацяжэнне прывада, і гэта прыводзіць да зносу абсталявання. Дзякуючы нашай распрацоўцы рух рысор (уздым-апусканне рэжучага апарата) не ўплывае на нацяжэнне рамяня. Жатка працуе больш плаўна, убірае ўраджай больш якасна, а яе мотарэсурс значна вышэйшы.

Слова — пераможцам

І, вядома, не маглі мы не паразмаўляць з пераможцамі конкурсу — тымі, чыя распрацоўка прызнана найбольш патрэбнай сучаснаму грамадству. Як ужо гаварылася, больш за ўсё заявак на конкурс паступіла ад сістэмы аховы здароўя — гэта як карысныя мадэлі, так і тэхналогіі стварэння фармацэўтычных прэпаратаў. І распрацоўка, што перамагла, — менавіта з гэтай сферы.

— На конкурс мы прадставілі арыгінальны лекавы прэпарат для лакальнай хіміятэрапіі злаякасных новаўтварэнняў галаўнога мозгу, — расказаў **галоўны спецыяліст па навуковай і навукова-інавацыйнай дзейнасці УП «Унітэхпрам БДУ» Павел БЫЧКОЎСКІ.**

Унікальны прэпарат «Тэмадэкс» — вынік сумеснай работы цэлага калектыву вучоных розных галін ведаў. Ідэя, распрацоўка, тэхналогія вытворчасці, пацвярджэнне бяспекі і эфектыўнасці прэпарата належаць вучоным НДІ фізіка-хімічных праблем БДУ. Клінічныя выпрабаванні і даследаванні праведзены супрацоўнікамі ўніверсітэта і ўрачамі сталічнай ГКБ хуткай медыцынскай дапамогі, РНПЦ анкалогіі і медыцынскай радыялогіі імя М. М. Аляксандрава і БДМУ.

— Праведзены клінічныя выпрабаванні на пацыентах 3-4 стадыі анказахворванняў, — канкрэтызаваў суразмоўнік.

Інавацыйнасць прэпарата — у схеме лячэння і ў саставе лекавага сродку. «Тэмадэкс» прымяняецца ў комплексным хірургіі для тэрапіі раку галаўнога мозгу рознай складанасці, растлумачыў вучоны. Гэта парашок для падрыхтоўкі біярассмоктвальнага гідрагеля. «Тэмадэкс» змяшчаюць у ложа выдаленай пухліны, і, паступова рассмоктваючыся, ён выдзяляе малекулы хіміяпрэпарата і падтрымлівае неабходную яго канцэнтрацыю для знішчэння ракавых клетак, што засталіся пасля аперацыі, і прадухілення рэцыдываў.

— Актыўнае рэчыва прыгнятае пухлінныя клеткі, якія засталіся, і за ўсю гісторыю прымянення прэпарата ніколі паўторных рэцыдываў не ўзнікала, — падкрэсліў Павел Бычкоўскі. — Як вынік, паляпшаецца якасць жыцця пацыентаў і павялічваецца яго працягласць. Нельга сказаць, што гэта панацэя, але ў комплексным лячэнні (хірургічнае ўмяшанне, сістэмная хіміятэрапія, прамянёвая тэрапія і лакальная хіміятэрапія) прэпарат паказвае сапраўды добрыя вынікі.

Нават у самых складаных выпадках працягласць жыцця пацыентаў з прымяненнем гэтага прэпарата павялічваецца на год і больш, адзначыў суразмоўнік, а ў 12 % выпадкаў — на пяць і больш гадоў.

На сваім стэндзе «Унітэхпрам БДУ» прадставіў і іншыя распрацоўкі — лінейку прэпаратаў для лакальнай хіміятэрапіі пухлін галавы, шыі, страўніка і брушной поласці.

— У свеце зарэгістраваны тры падобныя прэпараты. Адзін распрацаваны ў ЗША, і два — у Беларусі, — сказаў Павел Бычкоўскі.

Звыклая фармулёўка «не мае аналагаў у свеце» часам успрымаецца ўсяго толькі як рэкламны ход — з-за таго што занадта ўжо любяць яе журналісты. Але ў дадзеным выпадку яна дакладная і апраўданая. Вядомы амерыканскі прэпарат падобны па вобласці ўздзеяння, але адрозніваецца па складзе і тэхналогіі прымянення. Перавага айчыннай распрацоўкі — яшчэ і нізкі кошт.

— Калі кошт амерыканскага прэпарата — ад 13 да 15 тысяч долараў ЗША, то наш у 50 разоў таннейшы, — звярнуў увагу эксперт. — Справа ў тым, што ў нас прэпарат распрацоўваўся дзяржаўнымі ўстановамі ў рамках дзяржаўнага фінансавання, і з арганізацыяй яго вытворчасці таксама цалкам дапамагла дзяржава ў межах праграмы інавацыйнага развіцця.

«Тэмадэкс» уключаны ў клінічны пратакол Беларусі па дыягностыцы і лячэнні злаякасных новаўтварэнняў, і патрэба краіны ў гэтым прэпараце задавальняецца поўнасцю, падкрэсліў вучоны.

Аляксандра АНЦЭЛЕВІЧ.
Фота Віктара ДРАЧОВА.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

СВЯТА ДЛЯ КОЖНАГА

«ЖАЛЕЗНЫ ПРЫЁМ»

На пачатку маштабнай святочнай праграмы Жлобін, як раён з моцным індустрыяльным патэнцыялам, запрасіў удзельнікаў акцыі пазнаёміцца з прадпрыемствам-флагманам — Беларускім металургічным заводам. Удзельнікі «Марафону адзінства», блогеры і прадстаўнікі творчых калектываў на свае вочы ўбачылі, што такое металавытворчасць, пабывалі ў цэхах Беларускага металургічнага завода. Падчас экскурсіі па прадпрыемстве яны даведаліся, што сёння Жлобінскі БМЗ — адзінае прадпрыемства такога маштабу на постсавецкай прасторы. Завод стабільна развіваецца і ўкараняе новыя тэхналогіі.

Між тым менавіта ў цэхах БМЗ у рамках акцыі стартаваў новы праект — «Адну справу робім!». Ён накіраваны на ўмацаванне ўзаемадзеяння паміж прамысловымі прадпрыемствамі краіны, сумесную работу на карысць краіны. І цяпер працягнецца ў кожным горадзе на шляху «Марафону адзінства».

— Гэта цудоўная ідэя. Нашы прадпрыемствы — даўнія партнёры, і на працягу многіх дзесяцігоддзяў працуем разам. Такое ўзаемадзеянне дэманструе нашу згуртаванасць і сумесную работу на карысць рэспублікі. На БМЗ вырабляюць металакорд, які выкарыстоўваецца пры вырабе шын, што дае магчымасць нашым прадпрыемствам задавальняць патрэбы ўсіх аўтавытворцаў Мінпрама на 99,9 %, — адзначыў **генеральны дырэктар ААТ «Белшына» Аляксандр КАВАЛЁЎ.**

У сваю чаргу **генеральны дырэктар БМЗ Дзмітрый КОРЧЫК** ацаніў насычанасць і важнасць новага праекта ў рамках «Марафону адзінства».

— Такія сустрэчы ў рамках праекта «Адну справу робім» дазваляюць супрацоўнікам прадпрыемства напрамую задаваць пытанні кіраўнікам і атрымліваць адказы на хвалюючыя тэмы, што важна для будучыні завода, — падкрэсліў кіраўнік прадпрыемства.

«НЯСУМНАЯ НЯЛЕКЦЫЯ» І НЕ ТОЛЬКІ...

Асаблівае месца на карце Жлобіншчыны і назаўжды ў сэрцах жыхароў усёй краіны — мемарыяльны комплекс «Дзецям — ахвярам Вялікай Айчыннай вайны». Удзельнікі марафону — блогеры і прадстаўнікі творчых калектываў з розных рэгіёнаў аддалі даніну памяці ў Красным Беразе. Гэты мемарыяльны комплекс — адзіны ў сваім родзе на тэрыторыі СНД. У гады нямецкай акупацыі менавіта тут гітлераўцы стварылі зборны пункт для гвалтоўнай адпраўкі дзяцей у Германію.

У Красным Беразе ўдзельнікі акцыі наведалі таксама сядзібны комплекс XIX стагоддзя Козел-Паклеўскіх, размешчаны непадалёк ад мемарыяла. Амаль дзесяць гадоў таму скончылася яго рэстаўрацыя. Сёння палацава-паркавы ансамбль займае сваё пачэснае месца ў культурна-гістарычнай спадчыне Беларусі. Ён па праве лічыцца жамчужынай Жлобіншчыны і з'яўляецца вядомым цэнтрам прыцягнення турыстаў на Гомельшчыне.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Па традыцыі ўдзельнікаў «Марафону адзінства» чакалі на «Нясумнай Нялекцыі». Сустрэчу, якую прысвяцілі тэме выбару і яго значэнню ў жыцці і лёсе чалавека, арганізавалі на базе Жлобінскага дзяржаўнага каледжа сферы абслугоўвання. Спікерамі выступілі **намеснік міністра адукацыі Кацярына ПЯТРУЦКАЯ** і **кіраўнік праекта «Млын моды», загадчык аддзела моды і дызайну Нацыянальнага мастацкага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Ігар ІВАНОЎ.**

Як адзначыла Кацярына Пятруцкая, у рамках «Марафону адзінства» «Нясумныя Нялекцыі» ўжо прайшлі ў Маладзечне і Гомелі.

— Водгукі вельмі добрыя. Мы правялі апытанне: ці параілі б юнакі і дзяўчаты ўдзел у такім мерапрыемстве сваім сябрам, і 99,9 % апытаных адзначылі, што параілі б, — зазначыла намеснік міністра.

Ігар Іваноў падчас сустрэчы звярнуў асаблівую ўвагу на важнасць выбару будучай прафесіі для падлеткаў, аб значнасці і прэстыжы рабочых спецыяльнасцяў. Ён нагадаў, што рэспубліканскі фестываль-конкурс моды і фота «Млын моды» таксама робіць свой уклад у папулярызацыю прафесіі швачак, канструктараў, мадэльераў.

Падчас грамадска-культурнай акцыі на Жлобіншчыне прайшла цырымонія ўзнагароджання пераможцаў абласнога этапу конкурсу малюнкаў навучэнцаў пачатковых класаў «Мы разам» і рэспубліканскага конкурсу сачыненняў на тэму «Што такое адзінства».

ШЛЯХ У 30 ГАДОЎ — У АБ'ЕКТЫВЕ

У другі дзень у фае чыгуначнага вакзала Жлобіна «Марафон адзінства» запрасіў на адкрыццё фотавыстаўкі БелТА «Беларусь. Узлёт». Праект, які стаў знакавай часткай праграмы марафону, прадставіла асабіста **генеральны дырэктар Беларускага тэлеграфнага агенцтва Ірына АКУЛОВІЧ.**

Па яе словах, «Беларусь. Узлёт» дапаможа камусьці ўспомніць, камусьці — рэальна ўявіць і на свае вочы пабачыць, што давялося перажыць кожнаму гораду, мястэчку. На фотавыстаўцы прадстаўлены фотафакты і інфармацыйныя нагоды аб сацыяльна вострых праблемах, якія хвалявалі беларусаў 30 гадоў таму. На 40 стэндах — сучасныя фотаздымкі і кадры, артыкулы з мінулага, а таксама QR-коды — «ключы» да поўнай версіі значнага праекта БелТА.

Ірына Акуловіч звярнула ўвагу на некалькі здымкаў і публікацый на выстаўцы. Напрыклад, на фота, дзе экіпаж «хуткай дапамогі» не можа даехаць да пацыентаў. Справа ў тым, што ў той час на дзень на адну машыну выдавалася ўсяго 15 літраў бензіну. Прыводзіцца і факт з мінулага ў Жлобіне — артыкул пад назвай «Медык не марак, паліклініка не лодка». Матэрыял аб жлобінскай медустанове, у якой з-за прарыву каналізацыі не першы дзень урачы сядзяць у кабінетах з адчыненымі вокнамі, не могуць працаваць — няма святла, не працуе абсталяванне.

— Для гэтай выстаўкі ў Гомельскай вобласці, для Жлобіна, мы спецыяльна прадставілі некалькі артыкулаў, якія датычыліся менавіта гэтых тэрыторый, каб людзі разумелі, што такое «Беларусь. Узлёт» і што такое шлях у 30 гадоў. Гэта шлях, які праходзілі менавіта тут у Гомельскай вобласці, — зазначыла Ірына Акуловіч.

Гендырэктар Беларускага тэлеграфнага агенцтва згадала і яшчэ адзін з паказальных артыкулаў з мінулага Гомельшчыны.

— Адзіны камбінат у краіне на той момант, які вырабляў «малочку», знаходзіўся ў Гомельскай вобласці. Ён забяспечваў толькі адзін працэнт ад той патрэбы, што неабходна была маленькім дзецям. Уявіце, гаворыцца, што ў нас было на той момант сто шэсцьдзясят тысяч дзяцей і каля шасцідзесяці тысяч мелі патрэбу ў гэтым малочным харчаванні, а яго проста не было, — зазначыла Ірына Акуловіч. — Гэта не эмоцыі журналістаў, гэта канкрэтныя факты, якія расказваюць аб тым, як было ў краіне 30 гадоў таму. Людзям трэба расказваць менавіта аб іх рэгіёне, дзе яны жывуць, каб яны ведалі, што адбывалася. Прэзідэнт часта аб гэтым гаворыць: так, людзі могуць меркаваць паразнаму, але дзейнічаць варта так, каб твая краіна развівалася. Мы павінны быць адзінымі ў імкненні зрабіць нашу краіну лепшай, каб не паўтарыліся тыя жудасныя гісторыі, якія прадстаўлены на выставе.

Па словах Ірыны Акуловіч, прыцягвае ўвагу людзей прагрэс у нашым жыцці.

— Але гэта не толькі прагрэс. Гэта работа нашай дзяржавы і вынік таго дзяржаўнага планавання і тых сіл, якія ўкладаў наш Прэзідэнт і ўсе тыя, хто быў побач з ім, для таго, каб гэта быў менавіта ўзлёт, — дадала яна.

Важнай часткай рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі «Марафон адзінства» стала і фотапрэзентацыя БелТА «Суверэнная Беларусь». У яе аснове — 26 стэндаў, на якіх прадстаўлена больш за сто здымкаў, якія адлюстроўваюць самыя розныя сферы жыцця Беларусі і тое, як яны развіваліся за апошнія 30 гадоў.

ДЫЯЛОГ ПАКАЛЕННЯЎ

Тут жа, на чыгуначным вакзале, жыхары і госці Жлобіна чакалі спікераў «Знакавай сустрэчы». Яе гасцямі сталі аўтар песень, **салістка групы Aura, уладальніца медаля Францыска Скарыны Юлія БЫКАВА, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь, прадзюсар, кампазітар Яўген АЛЕЙНІК, генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, дэпутат Палаты прадстаўнікоў, старшыня праўлення Рэспубліканскага дзяржаўна-грамадскага аб'яднання «Беларускае таварыства «Веды» Вадзім ГІГІН і вядомы радыёвядучы Вадзім ШЭПЕТ.** На сустрэчы прапанавалі абмеркаваць, як нараджаюцца навіны — жывыя зносіны і хвалюючыя жыццёвыя пытанні, якія адрасавалі спікерам жыхары Жлобіншчыны, закранулі самыя розныя тэмы.

Калі песня становіцца навіной... Аб тым, як асабіста перажывала падзеі 2020 года іх сям'я, шчыра падзяліліся Юлія Быкава і Яўген Алейнік.

— Я была даверанай асобай нашага кандыдата, Аляксандра Рыгоравіча. Мы вельмі шмат ездзілі па краіне, адказвалі на пытанні людзей, але аўдыторыі не заўсёды былі добрымі і прыязнымі. Сутыкнуліся з тым, што людзі задавалі пытанні, на якія не хацелі пачуць адказы, — падзялілася Юлія Быкава.

Юлія і Яўген распавялі і аб гісторыі ўзнікнення іх песні «Любімую не аддаюць», напісаную на піку перажывання з-за таго, што адбывалася вакол у той час.

— Ты разумееш, што, калі не выкажаш сваю пазіцыю, яе выкажа той, хто крычыць мацней, але гэта не значыць, што за ім праўда. У жніўні 2020 года, калі мы назіралі, што адбывалася, адчулі, што як творчыя людзі не маем права не стварыць песню, кліп, які выкажа нашы перажыванні і аб'яднае нашых аднадумцаў. У нас ёсць усё для жыцця, не трэба нікому гэта аддаваць, а варта зберагаць, развіваць і захоўваць наша роднае і любімае, — азначыла сваю асабістую пазіцыю і сваёй сям'і Юлія.

Яўген Алейнік на «Знакавай сустрэчы» закрануў пытанне адказнасці медыйных асоб, блогераў з шырокай аўдыторыяй падпісчыкаў, якія аказваюць уплыў на людзей.

— Просьба не казаць, што інтэрнэт — гэта зло, што гэта

дрэнна, а проста быць там, каб фарміраваць правільнае меркаванне. Электаральны ўзрост у нашай краіне — з 18 гадоў. Калі назіраў за беспарадкамі 2020 года, заўважыў, што было шмат юнакоў да 18 гадоў. А яны жывуць у сацсетках. Раю таксама быць там, каб ведаць, аб чым кажуць у інтэрнэце, аб чым думаюць падлеткі. Гэта вельмі важна, — падзяліўся сваім меркаваннем Яўген Алейнік, сам бацька дваіх хлопцаў.

Разбірацца ў тым, што адбываецца ў інфармацыйным патоку, і быць разам... Такое пажаданне беларусам выказаў Вадзім Гігін.

— «Марафон адзінства», «Знакавая сустрэча» кожны раз выступаюць у абноўленым выглядзе. Кожны раз мы імкнёмся прапанаваць штосьці новае. Атмасфера — супер! Гэта вельмі крута, што наладжваецца такі дыялог, дыялог розных пакаленняў, — падкрэсліў дэпутат.

Удзельнікі «Знакавай сустрэчы» падзяліліся, што іх вельмі парадавала актыўнасць творчых жыхароў Жлобіншчыны, якія прыйшлі прывітаць гасцей.

— Самае галоўнае, што і пасля сустрэч людзі не разыходзяцца. Яны падыходзяць, цікавяцца — значыць, удаецца ўстанавіць той кантакт. Мы бачым, што прыходзяць людзі нераўнадушныя. Я асабіста атрымаў велізарны зарад энергіі, — падзякаваў Вадзім Гігін.

МОЛАДЗЬ АЦАНІЛА

Таксама ў рамках «Марафону адзінства» прайшоў традыцыйны гарадскі квэст «Гэта ўсё маё роднае». Арганізатары прадугледзелі ў праграме незвычайнае для горада дамашняе заданне. Так, неабходна было зняць кароткі відэаролік — прызнанне ў любові Жлобіну. Выкананне задання давала магчымасць зарабіць дадатковыя 20 балаў ужо на старце. Праходжанне ўсіх станцый квэсту займала ў каманд ад 15 да 25 хвілін. У кожным іспыце ім неабходна было адказаць на пытанні, звязаныя з гісторыяй Жлобіна і краіны, а таксама прайсці займальныя творчыя конкурсы: «Бульба-дэнс», угадванне мелодый вядомых кампазіцый, пераклад тэксту з беларускай на рускую мову і іншыя. Пераможцы атрымалі не толькі каштоўныя прызы ад партнёраў мерапрыемства, але і білеты на канцэрт «Час выбраў нас!».

Як падкрэсліў **першы сакратар Цэнтральнага камітэта БРСМ, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Аляксандр ЛУК'ЯНАЎ,** Жлобін чарговы раз становіцца важным пунктам на патрыятычнай карце краіны і прымае квэст «Гэта ўсё маё роднае».

— Гэта не проста спаборніцтва, але і магчымасць для кожнага ўдзельніка даведацца нешта новае пра нашу вялікую краіну, пра слаўныя старонкі яе гісторыі і сучасныя дасягненні. Мы бачым, што гэта падзея аб'ядноўвае пакаленні, прыцягвае і моладзь, і дарослых да агульнай справы, дазваляе ўсім удзельнікам праявіць свае веды і таленты, — падкрэсліў Аляксандр Лук'янаў.

Першы сакратар Цэнтральнага камітэта ГА «БРСМ» па традыцыі «Марафону адзінства» далучыўся да цырымоніі адкрыцця мурала «Будучыня Беларусі ў тваіх руках». Падчас прэзентацыі новага арт-аб'екта жыхароў Жлобіна прывітаў **намеснік старшыні Гомельскага аблвыканкама Дзмітрый АЛЕЙНІКАЎ.** Ён падкрэсліў, што творчая ініцыятыва моладзі — «Будучыня Беларусі ў тваіх руках» — пацвярджэнне народнага адзінства і развіцця краіны. Як было адзначана, практычна другі тыдзень запар Жлобін жыве ў надзвычай святочнай атмасферы. Горад адзначыў 40-годдзе Беларускага металургічнага завода, а пасля сустрэў і грамадска-культурную акцыю «Марафон адзінства».

НА КАНЦЭРТНАЙ ХВАЛІ

Між тым чаканай для жыхароў і гасцей Жлобіншчыны падзеяй стаў, не такія вядомыя і папулярныя, як прафесійныя артысты, але яны з такім жаданнем, бляскам у вачах, з такім глыбокім пасылам, што мы кожнаму з іх верым і рады, што яны тут, на сцэне, — падкрэсліў Андрэй Гузель.

У Жлобіне канцэрт «Час выбраў нас» стаў прэм'ернай пляцоўкай для новых кампазіцый выканаўцы Андрэя Цямчыка — «Крапчэйшымі сталі» і лірычнай песні аб каханні «Ведаць, што ты ёсць».

— «Крапчэйшымі сталі» — пра такія важныя і галоўныя пасылы пра нас, пра Беларусь, таму што мы ідзём скрозь цярні і перашкоды, пераадольваючы нейкія падножкі, складанасці, і спраўляемся выдатна. На «Марафоне адзінства» ў Жлобіне песню пачула шырокая публіка. Важна ведаць ацэнку і водгукі гледачоў у зале, — падзяліўся Андрэй Гузель.

ПРЫКЛАД ЖЫВОГА АДЗІНСТВА

На канцэрце «Час выбраў нас» удзельнікаў акцыі прывіталі і шаноўныя госці свята. Шчыра падзякаваў усім арганізатарам і ўдзельнікам «Марафону адзінства» за цеплыню і душэўнае натхненне **старшыня Гомельскага аблвыканкама Іван КРУПКО.**

— Натхненне ў сэрцы кожнага з нас, — зазначыў Іван Крупко. — Мы разам пішам няпростую, але надзвычай прыгожую гісторыю нашай Беларусі. Мы разам любім, абараняем свае сем'і і сваю Радзіму, таму што адно ад другога ніколі не аддзяляем. На нас спрабуюць уздзейнічаць палітычным націскам і эканамічнымі санкцыямі, асабліва на самыя эфектыўныя галіны нашай эканомікі. Больш за тое, уздзейнічаць на свядомасць нашых людзей, асабліва моладзі. Усё для таго, каб раскалоць наша маналітнае грамадства. Але, дзякуючы дальнабачнасці, дакладнаму кіраўніцтву Прэзідэнта, мы і ў далейшым будуем нашу дзяржаву для народа, — падкрэсліў Іван Крупко.

На канцэрце «Час выбраў нас» да ўсіх жыхароў Гомельскай вобласці, Жлобіншчыны і гасцей, удзельнікаў грамадска-культурнай акцыі звярнуўся **кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Дзмітрый КРУТОЙ.**

Ён расказаў аб чаканай рабочай паездцы кіраўніка дзяржавы ў Жлобін і непасрэдна на БМЗ. Дзмітрый Крутой падкрэсліў, што сёння развіццё Беларускага металургічнага завода — прыклад палітыкі Прэзідэнта, ад якой ён ні на адзін крок не адступіў за апошнія 30 гадоў.

— Хацелі ў 1990-х гадах распрадаць БМЗ па частках? Хацелі. А калі 20 гадоў таму наспела неабходнасць шукаць інвестыцыйныя рэсурсы на абнаўленне вытворчасці, іх выдзеліла фактычна ўся рэспубліка. Таму што адказнасць вялікая і абавязацельствы перад людзьмі вельмі вялікія. Але БМЗ, пачуўшы Прэзідэнта, усё зрабіў выдатна, вельмі дастойна. І сёння ўжо паступленні ў бюджэт даюць магчымасць нам плаціць пенсіі, будаваць цудоўныя сацыяльныя аб'екты, купляць лекі і несці іншыя важныя выдаткі. Вось прыклад жывога адзінства ўсёй краіны, — адзначыў кіраўнік Адміністрацыі.

Дзмітрый Крутой звярнуў увагу на ролю рэгіёнаў у цэлым у развіцці краіны.

— Прэзідэнт дакладна сказаў: наступныя пяць гадоў развіцця Беларусі — гэта час рэгіёнаў. На месцы будзе перададзена больш паўнамоцтваў, будуць перараз меркаваны рэсурсы, інструменты падтрымкі. І буйныя, сярэднія і малыя гарады, нашы раёны атрымаюць новае дыханне, — падкрэсліў Дзмітрый Крутой. — Насамрэч Жлобін — выдатны прыклад такой палітыкі. У вас ёсць магутны флагман БМЗ. Але, на жаль, за яго спінай іншыя прадпрыемствы, можа быць, не так моцна бачныя. І трэба падумаць над іх развіццём, — заключыў кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта.

РЫХТУЕЦЦА ПІНСК

Падчас рэспубліканскай грамадска-культурнай акцыі ў Жлобіне стаў вядомы чарговы горад на шляху «Марафону адзінства» — пунктам прыцягнення свята стане Пінск. Як паведаміла журналістам **кіраўнік рабочай групы па падрыхтоўцы акцыі Ганна ЛУКАШЭНКА,** у Пінск «Марафон адзінства» завітае 8—9 лістапада.

— Запрашаем усіх жыхароў Пінска, найбліжэйшых гарадоў наведаць мерапрыемствы марафону. Плануем таксама дапоўніць праграму новымі цікавымі падзеямі. Так, да падзей далучыцца каманда «МАЗ-СПОРТаўта». Мы плануем іх удзел у «Знакавай сустрэчы» і не толькі. Акрамя таго, у нас будуць вельмі цікавыя спікеры на канцэрце. Ён будзе дапоўнены незвычайнымі нумарамі. Таму будзе цікава. Прыязджайце ў Пінск, — заклікала Ганна Лукашэнка.

Кіраўнік рабочай групы адзначыла, што разглядаецца пытанне пашырэння геаграфіі грамадска-культурнай акцыі.

— Цяпер разглядаецца некалькі гарадоў. Думаю, у найбліжэйшыя некалькі тыдняў мы агучым, — дадала кіраўнік рабочай групы па падрыхтоўцы акцыі «Марафон адзінства».

Наталля КАПРЫЛЕНКА.
Фота аўтара і БелТА.

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА

Государственное предприятие
«Минский областной центр инвестиций и приватизации»
(Организатор аукциона)
по поручению **открытого акционерного общества «Краснодворцы»** (Продавец)
проводит повторный открытый аукцион

ПО ПРОДАЖЕ ЗЕРНОСКЛАДА С ПОЖАРНЫМ РЕЗЕРВУАРОМ

с инв. № 644/С-61266
общей площадью 428 кв. м и

ЗДАНИЯ ЗЕРНОСКЛАДА

с инв. № 644/С-61267
общей площадью 701 кв. м, расположенных на земельном участке с кадастровым номером 625082300001000066
площадью 1,2635 га *(право постоянного пользования)*
по адресу: Минская область, Солигорский район, Краснодворский с/с, 12, 0.3 южнее д. Пруссы.

Начальная цена с НДС (20 %) – **11 424,00** бел. руб.
Задаток 10 % от начальной цены – **1 142,00** бел. руб.
Стоимость снижена на 80 %.

Задатки перечисляются на р/с № BY55BPSB30121082600169330000 в ОАО «Сбер Банк», г. Минск, ул. Чкалова, 18/1, БИК BPSBBY2X, УНП 690324015, ОКПО 29250255, государственное предприятие «Минский областной центр инвестиций и приватизации», код платежа – 40901, OTHR.

Договор купли-продажи должен быть подписан в течение 10 (десяти) рабочих дней после проведения аукциона. Оплата за объект производится в течение 30 (тридцати) банковских дней со дня заключения договора купли-продажи, если иное не предусмотрено договором купли-продажи.

Победитель (единственный участник) аукциона оплачивает вознаграждение за организацию и проведение торгов в размере 7 (семи) процентов от окончательной цены продажи предмета аукциона, а также возмещает Продавцу затраты на публикацию извещения о проведении торгов.

Порядок проведения аукциона и оформления участия в торгах оговорен в условиях его проведения, размещенных на сайте организатора торгов: www.rlt.by.

Предыдущие извещения опубликованы в газете «Звязда» от 05.07.2023 г., 07.09.2023 г., 23.12.2023 г., 09.04.2024 г.

Аукцион состоится **11.11.2024 г. в 12.00** по адресу: г. Минск, ул. Чкалова, 5, каб. 324. Заявления на участие и необходимые документы принимаются по **06.11.2024 г.** до **16.00** по указанному адресу в каб. 320.

Тел: 8(017) 516-80-65, 516-80-64, 8(029) 102-21-17, 8(029) 136-31-11. Тел. для осмотра: 8(029) 140-29-49.

УНП 690071008

ООО «Фрондера» извещает о проведении публичных торгов в форме открытого аукциона по продаже имущества ООО «Производственная компания Ромакс»

Лот	Наименование	Начальная цена с учетом НДС 20%, бел. руб.	Задаток, бел. руб.	Шаг аукциона, бел. руб.
1	Грузовой фургон MERCEDES-BENZ ATEGO 815, рег. знак АЕ 5432-4, кузов (рама) № WDB9700151L088714, 2005 г. вып.	51 264,00	5 126,40	2 563,20
2	Автомобиль грузовой вагон изотермический PEUGEOT BOXER FT 440, рег. знак АМ 9817-4, кузов (рама) № VF3YEZMFC12305803, 2012 г. вып.	29 088,00	2 908,80	1 454,40
3	Автомобиль грузовой вагон изотермический PEUGEOT BOXER, рег. знак АМ 9825-4, кузов (рама) № VF3YEBMFC12023546, 2011 г. вып.	25 056,00	2 505,60	1 252,80

В отношении лота № 1 проводятся четвертые повторные торги. **Стоимость снижена на 40 %.** В отношении лотов №№ 2, 3 проводятся вторые повторные торги. **Стоимость снижена на 20 %.** Ранее публикация размещалась в газете «Звязда» № 195 (30329) от 05.10.2024 г., стр. 11

В отношении лотов имеется ограничение (обременение) в виде залога. Дополнительная информация по тел. +375(29)5767715 (Юлия)

Местонахождение лотов: г. Минск, ул. Калиновского, 117

Дата и время проведения торгов	**14 ноября 2024 года в 12.00 (регистрация с 11.30 до 11.55)** по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127
Срок приема заявлений и внесения суммы задатка	**С 10.00 29 октября 2024 года до 16.00 12 ноября 2024 года**

Условия для участия в торгах: 1. До подачи заявления необходимо внести задаток на р/с **BY36ALFA30122215570040270000**, код банка ALFABY2X, УНП 192789344. Получатель – ООО «Фрондера», назначение платежа: **OTHR 40901.** Задаток для участия в торгах по Лоту «__», ООО «Производственная компания Ромакс», проводимых 14.11.2024 г.
2. Заявление на участие (на каждый лот отдельное) и необходимые документы (соглашение о правах и обязанностях сторон в 2-х экземплярах (на каждый лот отдельное), копия платежного поручения о перечислении задатка, копия паспорта (стр. 31-33, действующая прописка); копия свидетельства о государственной регистрации – для ИП и юр.лица; документ, подтверждающий полномочия руководителя или представителя юр.лица, копия Устава – для юр.лица) принимаются в рабочие дни с 10.00 до 18.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127. Документы могут подаваться посредством направления почтой или личной подачи. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата и время получения организатором торгов оригинала заявления на участие в аукционе и полного пакета прилагаемых документов (в случае направления почтой – дата и время поступления документов на абонентский ящик организатора торгов). По вопросу подготовки необходимых документов для участия в аукционе обращаться по телефонам: +375(29)3082897, +375(29)3058650.
3. К участию в торгах допускаются лица, подавшие организатору торгов в указанный в извещении о проведении торгов срок заявление с приложением необходимых документов и зарегистрированные в журнале регистрации на участие в торгах. Победителем аукциона признается участник, предложивший в ходе торгов наивысшую цену. Результаты торгов оформляются протоколом в день проведения торгов.
4. В случае, если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником или для участия в нем явился только один участник, при согласии этого участника приобрести предмет торгов по начальной цене, увеличенной на 5 %. Комиссия в день проведения аукциона оформляет протокол о продаже предмета торгов этому участнику аукциона.
5. Победитель аукциона (Претендент на покупку) обязан возместить Организатору аукциона стоимость затрат на организацию и проведение открытого аукциона (вознаграждение аукциониста и затраты по размещению публикации в газете) на основании актов в течение 5 (пяти) календарных дней со дня проведения аукциона.
Вознаграждение аукциониста: по лоту № 1 – 6 %, по лотам №№ 2, 3 – 7 % от конечной цены предмета торгов.
Победитель аукциона (Претендент на покупку) должен подписать с Продавцом договор купли-продажи предмета торгов после возмещения затрат на организацию и проведение аукциона в течение 7 (семи) рабочих дней с момента подписания протокола о результатах торгов. Оплата приобретенного предмета торгов должна быть произведена в полном объеме не позднее 12 (двенадцати) рабочих дней со дня проведения торгов.
6. Подробнее с правилами проведения торгов можно ознакомиться в разделе «Ликвидация» на сайте: https://orgtorg.by/info/.
7. Все желающие могут предварительно ознакомиться с предметом торгов. Контактное лицо для осмотра предмета торгов – **Андрей, +375(29)3042560**.
8. Организация и проведение аукциона осуществляется на основании норм положения «О порядке продажи имущества ликвидируемого юридического лица с публичных торгов», утвержденного постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 08.01.2013 г. № 16.
9. Все мероприятия, связанные со снятием имущества с учета в уполномоченном государственном органе, осуществляет покупатель собственными силами и за свой счет на основании выданной доверенности.

Информация о продавце	**ООО «Производственная компания Ромакс» в лице ликвидатора – ООО «Партнёр-Консультант», тел. +375 (29) 576-77-15 (Юлия) (Гродненская обл., Ивьевский р-н, д. Липнишки, ул. Виленская, 12А, комн. 2В, УНП 590718744)**
Организатор аукциона	**ООО «Фрондера», 220113, г. Минск, ул. Мележа, 1, оф. 1127, тел. 8 (029) 308 28 97 • e-mail: info.torgi@orgtorg.by • сайт https://orgtorg.by • telegram https://t.me/orgtorg**

ИЗВЕЩЕНИЕ

о проведении **29 ноября 2024 года открытого аукциона** по продаже не завершенных строительством незаконсервированных жилых домов, дач

№ лота	1	2	3	4	5	6	7
Адрес земельного участка	**г. Речица, Героев Бреста, 38**	**г. Речица, ул. Большая Садовая, 24**	**г. Речица, ул. Довнар –Запольского М.В., 16**	**г. Речица, ул. Большая Садовая, 49А**	**г. Речица, ул. Науменко И.Я., 17**	**г. Речица, ул. Ведричская, 48**	**г. Речица, пер. Грибной, 17**
Кадастровый номер	324550100001016851	324550100001016849	324550100001016850	324550100001016848	324550100001016852	324550100001016847	324550100001016853
Площадь, га	0,0979	0,0997	0,1490	0,0891	0,0946	0,1143	0,1233
Целевое назначение участка/вид права	Для строительства и обслуживания одноквартирного жилого дома (земельный участок для размещения объектов усадебной застройки (строительства и обслуживания одноквартирного (блокированного) жилого дома, обслуживания зарегистрированной организацией по государственной регистрации недвижимого имущества, прав на него и сделок с ним квартиры в блокированном жилом доме)/частная собственность						
Условия инженерного развития инфраструктуры застраиваемой территории	**Существующие сети:** электроснабжения, водопровода, связи, газоснабжения	**Существующие сети:** электроснабжения, водопровода, связи, газоснабжения	**Существующие сети:** электроснабжения, водопровода, связи, газоснабжения	**Существующие сети:** электроснабжения, водопровода, связи, газоснабжения	**Существующие сети:** электроснабжения, водопровода, связи, газоснабжения	**Существующие сети:** электроснабжения, водопровода, связи, газоснабжения	**Существующие сети:** электроснабжения, водопровода, связи, газоснабжения
Описание не завершенного строительством жилого дома, дачи, его составных частей и принадлежностей (хозяйственных и иных построек), а также при наличии – инвентарный номер, площадь	Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, готовностью 4 % (фундамент) с составными частями и принадлежностями	Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, готовностью 5 % с составными частями и принадлежностями (фундамент)	Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, готовностью 30 % с составными частями и принадлежностями	Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, готовностью 6 % с составными частями и принадлежностями (фундамент)	Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, готовностью 10 % с составными частями и принадлежностями (фундамент)	Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, готовностью 6 % с составными частями и принадлежностями (фундамент)	Незавершенное незаконсервированное капитальное строение, готовностью 4 % (фундамент)
Характеристика расположенных на участке инженерных коммуникаций и сооружений (при их наличии)	Наличие возможности подключения коммуникаций						
Начальная цена, в том числе начальная цена не завершенного строительством жилого дома, дачи, земельного участка при его продаже в частную собственность, руб.	13 404,76 4260,90 / 9143,86	14 026,31 4714,33 / 9311,98	46 046,43 32 129,83 / 13 916,6	11 446,48 3124,54 / 8321,94	13 504,06 4668,42/8835,64	13 406,49 2730,87 / 10 675,62	14 975,08 3458,86 / 11 516,22
Размер задатка, руб.	1340,47	1402,63	4604,64	1144,64	1350,40	1340,64	1497,50
Ориентировочная сумма затрат на организацию и проведение аукциона, руб.	1433,70 + публикация в СМИ	2373,85 + публикация в СМИ	2373,85 + публикация в СМИ	2469,63 + публикация в СМИ	2357,34 + публикация в СМИ	2322,95 + публикация в СМИ	1444,92 + публикация в СМИ
Условия аукциона	-	-	-	-	При отсутствии нотариально заверенного письменного согласия смежного землепользователя часть фундамента подлежит сносу	-	-
Наличие ограничений (обременений) прав в использовании земельного участка	-	-	-	в связи с его расположением в охранных зонах электрических сетей	-	-	в связи с его расположением в охранных зонах электрических сетей

I. Аукцион состоится 29 ноября 2024 года в 15.00 по адресу: г. Речица, пл. Октября, 6.

В случае если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним участником либо для участия в нем явился только один участник, предмет аукциона продается этому участнику при его согласии по начальной цене предмета аукциона, увеличенной на 5 процентов.

II. Для участия в аукционе подаются и представляются:

- заявление об участии в аукционе;
- документ с отметкой банка, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) на текущий (расчетный) счет организатора аукциона: **р/с № BY63AKBB36044270044763000000, ЦБУ № 323 ОАО «АСБ Беларусбанк» г. Речица, получатель платежа – Речицкий райисполком, УНП 400001745, БИК AKBBBY2X;**
- гражданином – копия документа, удостоверяющего личность, без нотариального засвидетельствования;
- индивидуальным предпринимателем – копия свидетельства о государственной регистрации индивидуального предпринимателя без нотариального засвидетельствования;
- представителем гражданина или индивидуального предпринимателя – доверенность, оформленная в соответствии с требованиями законодательства;
- представителем или уполномоченным должностным лицом юридического лица Республики Беларусь – доверенность, выданная юридическим лицом, или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, копии документов, подтверждающих государственную регистрацию юридического лица, без нотариального засвидетельствования, документ с указанием банковских реквизитов юридического лица;
- представителем или уполномоченным должностным лицом иностранного юридического лица – копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть произведена в течение года до подачи заявления об участии в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык, доверенность или документ, подтверждающий полномочия должностного лица, документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с засвидетельствованным в установленном порядке переводом на белорусский или русский язык.

Документы, составленные за пределами Республики Беларусь в соответствии с законодательством иностранного государства, должны быть легализованы, если иное не предусмотрено законодательством.

Консолидированными участниками для участия в аукционе представляются также оригинал и копия договора о совместном участии в аукционе.

Для участия в аукционе гражданин, индивидуальный предприниматель и юридическое лицо (лично либо через своего представителя) подают заявление об участии в аукционе с указанием предмета аукциона, представляют документы, подтверждающий внесение суммы задатка (задатков) с отметкой банка, а также заключают с Речицким райисполкомом соглашение.

Граждане и юридические лица, желающие участвовать в аукционе в отношении нескольких предметов торгов, вносят задатки в размере, установленном для каждого из этих предметов.

При подаче документов на участие в аукционе граждане Республики Беларусь предъявляют паспорт гражданина Республики Беларусь, а представители граждан и юридических лиц, уполномоченные должностные лица юридических лиц – документ, удостоверяющий личность.

3. Условия, предусмотренные в решении о проведении аукциона и предоставлении земельного участка победителю аукциона либо единственному участнику несостоявшегося аукциона **(по лотам № 1-7)**:

в течение двух месяцев со дня утверждения протокола о результатах аукциона либо протокола о признании аукциона несостоявшимся в установленном порядке обеспечить государственную регистрацию права в частной собственности на земельный участок, ограничений (обременений) прав на него в Речицком филиале республиканского унитарного предприятия «Гомельское агентство по государственной регистрации и земельному кадастру». В случае невыполнения данного требования решение о предоставлении земельного участка считается утратившим силу;

в течение двух месяцев со дня государственной регистрации права частной собственности на земельный участок в установленном порядке обратиться в Речицкий райисполком за выдачей разрешительной документации на возведение одноквартирного жилого дома;

в течение одного года со дня государственной регистрации права частной собственности на земельный участок приступить к занятию участка в соответствии с целью и условиями его предоставления;

осуществить строительство одноквартирного жилого дома в сроки, определенные проектной документацией.

Порядок проведения аукционных торгов определяется постановлением Совета Министров Республики Беларусь № 220 от 23.03.2018 г. «О некоторых мерах по реализации Указа Президента Республики Беларусь от 26.12.2017 г. № 463».

Осмотр на местности земельных участков – по мере поступления обращений.

Прием заявлений на участие в аукционе с необходимыми документами осуществляется по адресу: Гомельская область, г. Речица, пл. Октября, 6, Речицкий райисполком, **с 8.30 до 13.00, с 14.00 до 17.00 по рабочим дням** и **заканчивается 25 ноября 2024 г. в 17.00.**

Контактные телефоны: **(8 02340) 3-62-60, 4-41-06, 3-64-01.**

На варце каштоўнасцяў

ПОШУК АЦЭНАЧНЫХ КАТЭГОРЫЙ, ДЫЯЛОГ, АСВЕТА

Як абараніць моладзь ад негатыўнага ўплыву

Разбурэнне сацыяльных сувязяў, уплыў віртуальных сетак на фарміраванне чалавека, новыя небяспечныя захапленні, пагоня за трэндамі, навязванне чужых поглядаў на жыццё, узаемаадносіны, сям'ю, культура адмены, спробы перапісвання і ўплыву на гістарычную памяць, адмаўленне таго, на чым раслі старэйшыя пакаленні і што для іх было дорага... Можна і далей пералічваць негатыўныя працэсы, якія адбываюцца ў грамадстве, у тым ліку і называць з'явы і выклікі, якія з'явіліся зусім нядаўна. Ці можна ім супрацьстаяць і хто можа дапамагчы адрозніць добрае і дрэннае? Якім чынам традыцыйныя каштоўнасці трэба перадаваць наступным пакаленням? Гэтыя пытанні былі ўзняты падчас сустрэчы ў Нацыянальным прэс-цэнтры, прысвечанай дзейнасці Грамадскага савета па маральнасці.

Пасяджэнні Грамадскага савета па маральнасці праходзяць у мемарыяльнай зале Саюза пісьменнікаў Беларусі.

ВЫХАВАННЕ АСОБЫ

— Маральныя асновы, якія сфарміравалі характар беларускага народа, з'яўляюцца для нас аксіёмай. Няма необходнасці даказваць каштоўнасць любові і павагі да бацькоў, сваёй Радзімы, значнасць сяброўства і працавітасці, вернасці, шчырасці і дабрыні. Маральнасць — гэта і найважнейшая прыступка да духоўнага развіцця чалавека, — заўважыў **Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін, Патрыяршы Экзарх усяе Беларусі, сустаршыня Грамадскага савета па маральнасці.** У той жа час ён звярнуў увагу, што каштоўнасці трэба выхоўваць у кожным пакаленні, а ў наш час яшчэ і абараняць, таму ў 2023 годзе і быў адноўлены Грамадскі савет па маральнасці, створаны ў 2009 годзе дзякуючы намаганням мітрапаліта Філарэта (Вахрамеева) і кіраўніка Саюза пісьменнікаў Беларусі Мікалая Чаргінца. Заснавальнікі адзначалі, што савет будзе імкнуцца садзейнічаць духоўнаму аздараўленню нацыі, зацвярджэнню ў беларускім грамадстве высокіх маральных прынцыпаў шляхам прыняцця пагадненняў, рэкамендацый, зваротаў да адпаведных дзяржаўных структур і ўстаноў.

— Пытанні маральнага здароўя, аздараўлення грамадства не менш актуальныя і сёння, — падкрэсліў уладыка Веніямін. — Неабходна ўказваць на спакусы, якія здольныя нашкодзіць падрастаючаму пакаленню, і пры неабходнасці засцерагаць ад іх.

Тут вялікую ролю можа адыграць грамадства. Важна не пакідаць без увагі распаўсюджванне шкоднага для дзіцячай аўдыторыі медыякантэнту, часам і з выкарыстаннем ненарматыўнай лексікі, заклікамі да спажывання алкаголю, наркатычных рэчываў.

— Мы бачым, што асобныя сучасныя захапленні, якія актыўна папулярызуюцца асабліва сярод маладых людзей, звязаны з імкненнем пазбавіць чалавека яго сапраўднага аблічча, адмовіцца ад высокага прызвання, свабоды выбару і адказнасці і прымераць на сябе вобраз бясслоўнай істоты, — папярэдзіў аб небяспецы мітрапаліт і звярнуў увагу, што ў інтэрнэт-прасторы найперш моладзь выбіраецца як аб'ект уздзеяння. На пытанне журналістаў аб стаўленні да квадробінгу уладыка нагадаў, што кожная гульня павінна садзейнічаць развіццю чалавека, яго найлепшых якасцяў, найперш душы. А чаму можна навучыцца, імітуючы паводзіны жывёл? Іншая справа, калі асоба будзе выхоўвацца на вопыце папярэдніх пакаленняў, арыентавацца на найлепшых прадстаўнікоў краіны, заслужаных дзеячаў, гістарычных персанажаў, святых, асветнікаў. Важна, каб цанілася тое, што ўзвышае чалавека, з'яўляецца высокамаральным, светлым... А бацькі, якія выгульваюць на павадках сваіх дзяцей, па сутнасці, патураюць эгаізму, імкнуцца выканаць усе іх жаданні, не задумваючыся аб наступствах.

«Сёння дзяржава шмат робіць для таго, каб заахвочваць людзей на стваральную працу. Напрыклад, прэмія «За духоўнае адраджэнне» прымушае задумацца над тым, што ў нас найлепшае ў духоўных пачатках, яе намінацыі падказваюць, якія кірункі неабходна развіваць».

АГУЛЬНАЯ СПРАВА

Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі, сустаршыня Грамадскага савета па маральнасці Алесь КАРЛЮКЕВІЧ расказаў што тэмы, якія паступаюць у Грамадскі савет па маральнасці і ўздымаюцца на яго пасяджэннях, датычацца розных сфер, найперш культуры і адукацыі, напрыклад, абмяркоўваюцца паводзіны навучэнцаў у школе, узаемаадносіны сям'і і школы. Ён падзякаваў Міністэрству адукацыі за актыўнае супрацоўніцтва, у савеце бяруць удзел рэктары розных навучальных устаноў, кіраўнікі сістэмы адукацыі, тыя, хто ведае сітуацыю знутры.

Сярод пытанняў, якія паступалі ў савет па маральнасці, былі і такія, калі неабыякавыя грамадзяне прасілі звярнуць увагу на рэпертуар асобных выканаўцаў, тэатраў, на ўзровень культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў, чысціню мовы, распаўсюджванне астралогіі, уплыў блогераў, музычнае суправаджэнне ў летніх дзіцячых лагерах.

— У грамадстве ёсць тыя ці іншыя погляды, якія мы хацелі б агучыць і генерыраваць для дэталёвага абмеркавання, прапрацоўкі. Шчырая размова грамадства з дзяржавай, з дзяржаўнымі інстытутамі магчыма ва ўмовах стварэння пэўнай атмасферы. Важна, каб людзі, якія да нас звяртаюцца, разумелі, што іх прапановы будуць пачуты, і гэта не будзе просты, класічны афіцыйны адказ, — заўважыў Алесь Карлюкевіч. Прадстаўніцтвы савета па маральнасці працуюць у рэгіёнах. Гэту работу праводзяць людзі, якія займаюць кіруючыя пасады, маюць аўтарытэт у грамадстве.

НАЛАДЖВАННЕ КАНТАКТАЎ

Рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Рэспублікі Беларусь, старшыня камісіі Грамадскага савета па інфармацыйнай і выдавецкай дзейнасці Ігар БУЗОЎСКІ заўважыў, што асэнсаванне і разуменне духоўных і маральных каштоўнасцяў надзвычай важнае, бо ў далейшым на гэтым будуецца ў тым ліку і такое паняцце, як дзяржаўнасць. Духоўныя і традыцыйныя каштоўнасці яшчэ трэба вызначыць.

— Сёння дзяржава шмат робіць для таго, каб заахвочваць людзей на стваральную працу. Напрыклад, прэмія «За духоўнае адраджэнне» прымушае задумацца над тым, што ў нас найлепшае ў духоўных пачатках, яе намінацыі падказваюць, якія кірункі неабходна развіваць.

Як заўважыў Ігар Бузоўскі, сёння важна вызначыцца з тым, што з'яўляецца каштоўнасцямі, іх актуалізацыяй. Напрыклад, трэба сёння прыкласці намаганні для таго, каб папулярызаваць такую каштоўнасць, як працавітасць. На жаль, сёння яна страчвае тое значэнне, якое мела раней. Але варта думаць, як яе падаваць і на дзяржаўным узроўні. Напрыклад, у Кітаі такое паняцце спалучана з паняццем багацця — паспяховасць людзей непасрэдна звязваецца з іх працавітасцю.

— Сёння прэстыжнымі сферамі з'яўляюцца ІТ, нанатэхналогіі. Мы можам нават саромецца, што сябе асацыіруем з сельскагаспадарчай рэспублікай. А гэта тое, чым трэба навучыцца ганарыцца. Сёння перад саветам стаіць задача пошуку ацэначных катэгорый, — упэўнены Ігар Бузоўскі. А прасоўваць правільныя пасылы, на яго думку, можна і праз грамадскія ініцыятывы. Яскравы прыклад таму — праект БРСМ «Уладар сяла», працавітасць падчас спаборніцтва гаспадароў падаецца і як заслуга ў сямейным выхаванні.

— Людзі нашага пакалення ўсведамляюць духоўныя багацці, якія назапашаны ў нашай краіне, і нам не трэба саміх сябе пераконваць, чым трэба даражыць. Неабходны дыялог з моладдзю, — упэўнена **генеральны дырэктар Вялікага тэатра, старшыня камісіі па культуры Грамадскага савета Кацярына ДУЛАВА.** — У старшынь камісій ёсць даручэнні па правядзенні розных форм работы з грамадскасцю. Лічу прынцыповым выраз: «Сёння дзеці — заўтра народ». Таму сустрэчы з кампетэнтнымі людзьмі ў навучальных установах неабходныя.

Дарэчы, у Вялікім тэатры апрабоўваюцца розныя формы работы з падрастаючым пакаленнем. Ёсць дні, калі тэатр «аддаецца дзецям», праводзяцца для іх сустрэчы, заняткі, ствараецца асяроддзе, у якім малыя могуць развівацца ў тым ліку духоўна. Паспяхова праходзяць сустрэчы са студэнтамі, якія пасля спектакля абмяркоўваюць тое, што пабачылі на сцэне.

— Мы часам недаацэньваем магчымасці, гатоўнасць моладзі гаварыць з намі на розныя тэмы. З імі можна і важна прагаварыць розныя тэмы, пытанні: веры, маральнасці, узаемаадносін, сям'і, — адзначыла Кацярына Дулава. Яна ўпэўнена, што форм для асветы, прапаганды духоўных і маральных каштоўнасцяў можа быць багата. Пасадзейнічаць фарміраванню супольнасці, якая гатова гаварыць пра тое, што сапраўды з'яўляецца важным у жыцці, павінен і конкурс, заснаваны Дзяржаўным саветам па маральнасці і названы ў імя асветніка Кірылы Тураўскага «У гармоніі з сабой і светам», да якога могуць далучацца як прафесійныя літаратары, журналісты, публіцысты, так і вучнёўская і студэнцкая моладзь.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.
Фота Віктара ДРАЧОВА.

«Сярод пытанняў, якія паступалі ў савет па маральнасці, былі і такія, калі неабыякавыя грамадзяне прасілі звярнуць увагу на рэпертуар асобных выканаўцаў, тэатраў, на ўзровень культурна-асветніцкіх мерапрыемстваў, чысціню мовы, распаўсюджванне астралогіі, уплыў блогераў, музычнае суправаджэнне ў летніх дзіцячых лагерах».

ТАЯМНІЦА ЗНІКЛАГА КАПЯЛЮШЫКА ЦЁТКІ,

альбо Архівіст — справа пажыццёвая

«Жывы дакумент не заменіш ніякай копіяй», — заўважыла неяк вядомы архівіст Ганна Запартыка.

Сапраўды, дакументы мінулага, сведкі беларускай гісторыі, для яе — жывыя. Проста не кожны здольны чуць іх прыглушаныя пылам гадоў галасы, не кожны гатовы ахвяраваць сваімі сіламі, часам, творчай энергіяй, каб тыя галасы былі пачуты сучаснікамі, засталіся ўцямнымі для нашчадкаў. Шмат гадоў Ганна Вячаслаўна ўзначальвала Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва. Здаецца, няма такой асобы беларускай гісторыі, пра якую яна не змагла б распавесці штось цікавае. Менавіта дзякуючы такім неабыякавым, апантаным прафесіяналам заўсёды выжывала нацыянальная культура. Чытачы «Звязды» з задавальненнем сустракаюць на старонках газеты артыкулы Ганны Запартыкі, у якіх разгадваюцца таямніцы нашай гісторыі. Гэтымі днямі Ганна Вячаслаўна адзначыла свой юбілей. Мы сустрэліся з ёй, каб пагутарыць пра яе творчы шлях — а гаворка ўсё адно атрымалася пра беларускую гісторыю і яе дзеячаў... А як іначай, бо гэта сапраўды справа жыцця юбіляркі.

— Колькі гадоў ты аддала Беларускаму дзяржаўнаму архіву-музею літаратуры і мастацтва?

— Пачала там працу з 1978 года... Выходзіць, сорак шэсць гадоў, так? Прыйшла туды пасля філфака, з настроем паспрабаваць, паглядзець, а пасля мо знайсці штось больш грашавітае... Але адна старэнькая супрацоўніца архіва тады сказала мне: «Ты тут застанешся». Яна мела рацыю — я так і засталася.

— Зацягнула гэтая справа?

— Так, ад фонду да фонду — і зацягнула. Першыя гады, вядома, былі перапынкі: нарадзіліся дзеці — сын, пасля дачка... Да 1993 года асноўнай маёй задачай як архівіста было працаваць з фондамі нашых творчых устаноў — Саюза кампазітараў, Саюза кінематаграфістаў, Саюза мастакоў, Саюза пісьменнікаў... Працавала з фондамі часопісаў «Полымя», «Маладосць», «Нёман», «Работніца і сялянка». Да архіваў такіх адносіны былі трапяткія, паважлівыя, але ніхто адмыслова імі не займаўся, у рэдакцыях яны захоўваліся ў неапрацаваным стане. Памятаю, на кінастудыі «Беларусьфільм» я знайшла нават дакументы часоў вайны і першых пасляваенных гадоў, пачынаючы з 1943 года, калі толькі задумвалася вяртанне кінастудыі ў Беларусь, ішла падрыхтоўка да здымак там першых фільмаў... І гэтыя каштоўныя дакументы не былі ўнесены ў дзяржаўны рэестр. Так што я ведала «кухню» ўсіх творчых устаноў, даследаванні зацягнулі...

— І гэта менавіта пасля філфака?

— Так, філалагічны факультэт даў добрую падрыхтоўку. У нас былі цудоўныя выкладчыкі: Ніл Гілевіч, Вячаслаў Рагойша, Алег Лойка, Іван Навуменка...

— А якая была самая першая адметная архіўная справа?

— Першае, што мне даручылі, — навуковую апрацоўку фондаў асабістага паходжання. І першыя асобы, фонды якіх я апрацавала, — Рыгор Няхай і Яўген Васілёнак, пісьменнікі, якія на сёння падзабытыя. Вельмі старалася... Рыгор Няхай быў яшчэ жывы, я з ім сустракалася. Да нараджэння сына паспела яшчэ зрабіць фонды акцёрскія — Барыса Платонава і Ірыны Ждановіч, старых купалаўцаў... А калі выйшла з дэкрэтнага адпачынку, мне і прапанавалі працаваць з фондамі творчых арганізацый. Але і да асабістых фондаў звярталася: мне гэта падабалася.

— А якая была першая публікацыя, якую лічыш знакавай для сябе?

— Калі я прыняла пасаду дырэктара архіва, у кабінеце выявіла шмат цікавага. Мая папярэдніца не паспела шмат чаго падрыхтаваць да здачы. Я знайшла цэлы пакет дакументаў з архіва Каруся Каганца. Іх гісторыя пачалася з Віталя Скалабана. Недзе ў 1985 годзе ён пабываў у Маскве ў дачкі Каганца Пуцяты Галіны Казіміраўны. Гісторыка не пакінулі абыякавым убачаныя матэрыялы, што належалі сям'і Кастравіцкіх. Адразу ж дырэктар архіва-музея літаратуры і мастацтва напісала Галіне Казіміраўне ліст з просьбай перадаць у архіў-музей дарагія рэліквіі. У 1992 годзе Галіна Казіміраўна прыехала ў Беларусь на адкрыццё помніка свайму знакамітаму бацьку і прывезла бясцэнны дарунак: нататнік Карла Кастравіцкага (бацькі Каруся Каганца), візітоўку з аўтографам і фотаздымкі самога пісьменніка, ягоны ліст да будучай жонкі Ганны Канстанцінаўны, пенсійную кніжку апошняй ды інш. Я зрабіла на ўсё знойдзенае вопіс, і мяне зацікавіў нататнік, самы стары дакумент архіва. Я ўбачыла там згадкі пра кляштар бернардзінцаў, дзе падчас паўстання знаходзілася вязніца, — і зразумела, што гэта ж той самы будынак, у якім сёння працуе архіў. Пачала даследаваць... І вынікам стала першая мая навуковая публікацыя.

— Так што першым персанажам навуковых даследаванняў аказаўся Карусь Каганец?

— Так. Пасля — Паўліна Мядзёлка. Потым мне замовілі нарысы для зборнікаў, якія выпускала выдавецтва «Юнацтва», пра Еўфрасінню Полацкую і Рагнеду — напалову мастацкія, напалову навукова-папулярныя... Займалася і пакаленнем літаратараў 1920—1930-х, часоў «Маладняка» і «Узвышша». Я ж ініцыявала «Узвышаўскія чытанні», якія ўпершыню адбыліся ў 2001 годзе, і «Архіўныя чытанні» з 2003 года. І першыя, і другія адбываюцца да гэтай пары. Ганаруся гэтым.

— А дысертацыю не думала пісаць?

— Думала. Але калі заняла пасаду дырэктара архіва, не было ўжо зусім часу. А я ж яшчэ дваццаць пяць гадоў выкладала ў Беларускім дзяржаўным універсітэце на гістарычным факультэце. Ну і што датычыцца асабістага жыцця — мы будавалі дом у Ратамцы, клопатаў хапала. А напрацовак шмат, засталіся яшчэ нявыдадзеныя зборнікі, пра таго ж Эпімах-Шыпілу.

— І цяпер працягваеш займацца даследаваннямі?

— Так. Да наступных «Архіўных чытанняў» падрыхтавала даклад пра Цётку. Пра яе я не раз ужо пісала, але ёсць яшчэ шмат нераскрытых тэм. Па-першае, гісторыя яе спадчыны. Па-другое, варта ўдакладніць яе біяграфію. Па-новаму прачытаць дакументы, тыя ж атэстаты — хто пакінуў свае подпісы, хто быў настаўнікам Цёткі, хто на яе ўплываў. Усе імёны ўжо мною разгаданы. Цікавая тэма — Цётка-падарожніца. Яна шмат ездзіла па Еўропе, Першую сусветную вайну сустрэла ў Фінляндыі. І яшчэ аспект — яе жаночы лёс. На канферэнцыі хачу зрабіць даклад пра фатаграфіі і фатографаў Цёткі. Фатаграфій захавалася мала, і датуюць іх вельмі хаатычна. Вось на фота яна не зусім з элегантнай прычоскай, дык вырашылі, што гэта, відаць, ужо Першая сусветная вайна пачалася, не да прычосак, і датавалі 1914 годам. І ніхто не звяртае ўвагі, што фота скапіравана з дакумента, на якім стаіць дата — 1910 год. Максім Лужанін у сваіх успамінах піша, што Янка Купала дэманстраваў яму здымак, на якім Цётка ў капялюшыку, са стужачкамі, якія развяваюцца па ветры. Стужачкі са здымка прыбрала сама Цётка, бо ёй трэба быў той здымак для студэнцкай кніжкі, а гэта афіцыйны дакумент. Але самае цікавае, што ў савецкі час з Цёткі на тым здымку капялюшык знялі — і фота пачало перадрукоўвацца ўжо без капялюшыка, які не адпавядаў вобразу народнай паэткі-рэвалюцыянеркі.

— Фоташоп стагадовай даўніны?

— Так! І я задалася пытаннем — хто ж яе фатаграфаваў, такую чароўную, у капялюшыку? Думаю, гэта быў вельмі дарагі ёй чалавек, з якім яна сустрэлася ў Вільні, а пасля жыла побач у Закапанэ, разам слухала лекцыі ў Ягелонскім універсітэце.

— І гэта не яе муж, Сцяпан Кайрыс?

— Не. Хаця Кайрыс да яе туды прыязджаў у Закапанэ, і яна да яго ездзіла ў Расію, дзе ён працаваў інжынерам.

— То-бок, у іх з мужам былі адносіны таварыскія, платанічныя... А з кім былі рамантычныя, за кім яна паехала, невядома?

— Дапускаю, што гэта быў Барыс Вігілёў, рускі рэвалюцыянер. Я знайшла ўспаміны яго жонкі Алексіеўскай, дзе яна згадвае «какую-то фельдшерку», якая дапамагала яе мужу, то-бок Алаізу Пашкевіч. Ён славіўся як выдатны фатограф. Пакуль што я ўсё гэта асэнсоўваю, шукаю дадатковыя крыніцы, параўноўваю даты.

— А бывала, што ў дакументах знаходзілася тое, пра што не напішаш?

— Так, вядома. Калі я пасябравала з пляменніцай Янкі Купалы Ядвігай Раманоўскай, яна пачала адкрываць мне таямніцы сваіх калекцый і аддала лісты Пятра Глебкі да Паўлюка Труса. Я стала чытаць хлапечыя сакрэты тых юных яшчэ паэтаў — Паўлюка Труса, Пятра Глебкі, Максіма Лужаніна... Хлопцы, адораныя Божай міласцю, заставаліся ўсё адно жывымі людзьмі, хваліліся нейкімі любоўнымі прыгодамі, часам перабольшвалі тыя прыгоды, свае раманы з дзяўчатамі, залёты... Ці варта было ўсё гэта публікаваць, даючы падставу плёткам? І калі рыхтаваўся зборнік твораў Паўлюка Труса, туды некаторыя эпізоды не былі ўключаны.

— Многае пераацэньваецца з часам, і дакументы ў тым ліку... Віталь Скалабан паўтараў: больш за ўсё лжэ дакумент. Гэта значыць, заўсёды трэба ўлічваць кантэкст, у якім гэты дакумент ствараўся. Люблю параўноўваць, напрыклад, аўтабіяграфіі нейкай асобы, напісаныя ў розныя часы: адзін раз чалавек піша, што яго бацька да рэвалюцыі працаваў чыноўнікам, а другі раз пазначае, што той з бедных сялян...

— Так здаралася часта. «Нацягвалі сялянскасць» у біяграфіі, знаходзілі рэвалюцыйныя матывы ў творах. Храналогія шмат што падказвае. Ацэньваючы творы Цёткі, трэба ўсведамляць кантэкст яе жыцця. Да 1904 года яна піша пра беларускую прыроду, вёску... 1905 год. Знаёмства з вядомым рэвалюцыянерам Вігілёвым, многімі беларускімі дзеячамі, сумесныя паездкі і выступленні на мітынгах. І ў яе з'яўляюцца вершы-пратэсты... 1906 год — разгром рэвалюцыі, суд, расчараванне... Навязлівы матыў крыві ў творах. У 1907 годзе Алаіза Пашкевіч жыве за мяжой, ратуецца ад сухотаў у Закапанэ і ніводнага верша не напісала. 1911 год — шлюб са Сцяпанам Кайрысам, вяртанне ў Расійскую імперыю пад новым прозвішчам. Перахадзіць на публіцыстыку, піша апавяданні, клапоціцца пра адукацыю беларускіх дзетак. Успомнім першы зборнік Уладзіміра Дубоўкі пасля яго рэабілітацыі — здаецца, нічога незвычайнага, добрыя творы, у тым ліку падрэдагаваны самім аўтарам верш «О, Беларусь, мая шыпшына»... А калі раскладаеш вершы тыя па храналогіі, бачыш: вось яна, пярэрва ў дваццаць пяць гадоў... У чытача павінна ўзнікнуць пытанне: а дзе быў паэт гэтыя дваццаць пяць гадоў?

— За час работы ў архіве даводзілася нярэдка і самой здабываць дакументы?

— Вельмі часта... Усе замежныя нашы фонды так і прыйшлі — праз асабістыя кантакты, даводзілася карыстацца дапамогай і Міністэрства замежных спраў, і нашых пасольстваў, ездзіла сама ў Санкт-Пецярбург, у Маскву, у Вільню... Вазіла архівы ў чамаданах.

— Страшна было?

— Здаралася. Як я ў архіў Адама Бабарэкі везла... 1999 год, стагоддзе Адама Бабарэкі. З нашай ініцыятывы адбыліся святкаванні. Дачка Бабарэкі Алеся Адамаўна была запрошана ў Мінск. Сустракалі яе вельмі цёпла. Рэпарцёры бралі інтэрв'ю проста на вакзале, быў зняты нават дакументальны фільм. Пасля такіх шырокіх святкаванняў падчас канферэнцыі Алеся Адамаўна паабяцала, што перадасць архіў бацькі нам. Вельмі хутка я паехала за ім у Маскву... Плацкартны вагон. Адны мяшочнікі. У вагоне такі вэрхал, такі рух усю ноч... А я везла фотаздымкі вялікага фармату, на шырокім паспарту. Яны ў мяне нікуды не змяшчаліся. Я нейкага мужчыну папрасіла пакласці іх на самую верхнюю паліцу над уваходам. Ён у мяне пытаецца: «Что вы такое везете?» Я адказваю: «Гэта скарбы Беларусі». Ён вырашыў, што я жартую. А я ўсю ноч не прымружвала вачэй.

— А было такое, што губляўся дакумент?

— На маёй памяці такога не было. Хаця ваціла дакументы часта, і тут, па Беларусі. У Мінску ведала адрасоў многа, бывала ў дамах вядомых людзей. Самыя складаныя, аб'ёмныя архівы часам сама і разбірала. Таго ж Адама Бабарэкі ці архіў Валянціны Коўтун — у яе шмат было заблытана. Тэксты ў некалькіх асобніках, і ў кожным асобніку праўкі розныя. Як цяжка ўсё гэта злучыць... У рэшце рэшт на сваім досведзе я напісала дапаможнік «Методыка работы з дакументамі асабістага паходжання ў дзяржаўных архівах Беларусі». З практычнага пункту гледжання, гэты дапаможнік мае падставы жыць доўга. Але мяняюцца прававыя нормы, і трэба было б пэўныя змены ўнесці.

— Падобна, архівіст — справа пажыццёвая... А ці бывала, што сніліся героі даследаванняў?

— Ого, яшчэ як сніліся... Якуб Колас мяне папракаў, што доўга чакае ў метро. Снілася, што працую, і ніяк не ўдаецца датаваць дакумент ці разабраць почырк. Падобнае здаралася і ў рэальнасці. Я добра ведала почырк Паўлюка Труса, але аднойчы зрабіла памылку, якая пайшла ў публікацыю. Потым вельмі доўга ўглядалася ў дакумент і зразумела, што гэта пісаў не Трус, а Пятро Глебка. Але почырк у іх настолькі падобны...

— Па почырку многіх пазнаеш?

— Так. Ведаю почырк Уладзіміра Караткевіча, Міхася Мушынскага, Івана Навуменкі, Івана Шамякіна, Івана Мележа, Максіма Танка — у Танка, дарэчы, адзін з самых прыгожых почыркаў... І Браніслава Эпімах-Шыпілы, і Язэпа Пушчы, і Адама Бабарэкі... Я заўсёды пазнаю іх почырк.

Людміла РУБЛЕЎСКАЯ

Сваё. Роднае

Гартаючы летапіс Прыдзвіння

У Віцебскай абласной бібліятэцы імя У. І. Леніна адбылася прэзентацыя кнігі «Краязнаўчы атлас Віцебскага раёна» кандыдата гістарычных навук, дацэнта Мікалая ПІВАВАРА. У ёй аўтар змясціў інфармацыю аб гістарычных і прыродных помніках раёна, якія павінен убачыць кожны беларус.

«Краязнаўчы атлас Віцебскага раёна» — не першае тварэнне Мікалая Васільевіча, за трыццаць гадоў сваёй даследчай дзейнасці гісторык выпусціў каля 18 кніг. Усе яны прысвечаны Прыдзвінню і паўночнаму рэгіёну: выдатным асобам, унікальным мясцінам і памяці аб героях Вялікай Айчыннай вайны. Напрыклад, аналагаў выданню «Краязнаўцы Віцебшчыны» няма ў іншых рэгіёнах нашай краіны, а гісторыі Мазалаўскага сельсавета Віцебскага раёна прысвечана асобная вялікая кніга.

Ствараючы «Краязнаўчы атлас» на працягу 10 гадоў (а збор матэрыялаў заняў прыкладна тры дзесяцігоддзі), Мікалай Васільевіч сабраў унікальныя славутасці ўсіх сельскіх Саветаў раёна на 320 старонках. У кнізе размешчана каля 1000 ілюстрацый і фотаздымкаў, а таксама 15 карт. У кожным з мястэчкаў, пра якія з новых старонак расказвае аўтар, Півавар пабываў сам і разам з лужаснянскімі кадэтамі — членамі турысцкага эколага-краязнаўчага клуба «Дзвіна», які арганізаваны на базе Віцебскага кадэцкага вучылішча. «Першая задача, якую я ставіў перад сабой



пры рабоце над кнігай, — зрабіць абагульняльнае выданне даведачнага характару, якое б прэзентавала краязнаўчыя рэсурсы і турыстычны патэнцыял раёна. Другая — правесці своеасаблівую інвентарызацыю спадчыны, зрабіць зрэз стану матэрыяльнага, духоўнага, прыроднага багацця. Гэта спроба паказаць, што маем, чым багаты рэгіён, дзе можна адпачыць, чаго не хапае для далейшага развіцця», — расказвае Мікалай Васільевіч.

Кніга атрымалася зручнай для ўспрымання: інфармацыя падаецца па геаграфічным прынцыпе ў алфавітным парадку, маецца тэматычны паказальнік. Півавар нават увёў новыя катэгорыі аб'ектаў: краязнаўчы помнік і ландшафтны турызм. Пад першым аўтар разумее не толькі будынкі, але і прадметы, якія нясуць гістарычную каштоўнасць. Так, напрыклад, у вёсцы Курына ёсць кацярыненскія сані, якія апынуліся ў населеным пункце пасля праезду імператрыцы са світы праз горад Вележ. Да катэгорыі «ландшафтны турызм» краязнаўца аднёс рэкі і азёры, дрэвы і мясціны Віцебскага раёна, якія хоць і не адносяцца афіцыйна да помнікаў прыроды, аднак усё роўна з'яўляюцца жамчужынамі рэгіёна, дзе можна адпачыць.

Адметна, што ў кнігу не ўвайшоў горад Віцебск, бо, па словах аўтара, горад і яго славутасці патрабуюць асобнага выдання. А гэты атлас Віцебскага раёна ў прамым сэнсе з'яўляецца дапаможнікам для інвестараў, турыстаў, журналістаў і ўсіх, хто хоча наведаць Прыдзвінне або пачаць тут бізнес-справу.

Спыняцца на дасягнутым Мікалай Васільевіч не збіраецца: выдаўшы адну кнігу, ужо праектуе другую. Гісторык плануе прысвяціць асобнае выданне ўнікальным прыродным аб'ектам раёна, а іх, вядома, багата: гэта і самая высокая хвоя ў Беларусі паблізу вёскі Сушчова, і крынічка Шмырова ў Заполлі, і «два браты» — дуб і ясень. На чарзе — «Гонар і слава Прыдзвіння: землякі і асобы, якія праславілі наш край», літаратурны, мастацкі, эканамічны, гістарычны і канфесіянальны атласы Віцебскага раёна.

З кожным годам выдаць сваю кнігу становіцца цяжэй, гэта патрабуе вялікіх фінансавых укладанняў. Аднак усё ж такі знаходзяцца неабыякавыя да сваёй малой радзімы людзі, якія дапамагаюць аўтару ў гэтай нялёгкай справе. Бо, як той казаў, напісанае застаецца для нас і нашых нашчадкаў.

Аляксандра ГВОЗДЗЕВА, фота аўтара.

ЭНЦЫКЛАПЕДЫЮ СТВАРЫЛІ КАЗАЧНІКІ

Асалоду, задавальненне выклікае ўжо толькі адзін прагляд унікальнай мастацкай кнігі пра прыроду, якая пабачыла свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура» па заказе і пры фінансавай падтрымцы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, — «Казачнай энцыклапедыі беларускага лесу».

Маляўніча афармленая, яна выйшла ў серыі «Сямейнае чытанне» накладам 1500 экзэмпляраў і складаецца з паэтычных і празаічных твораў пісьменнікаў розных пакаленняў. Адрасавана кніга чытачам малодшага школьнага ўзросту. Укладальнік (а яшчэ і аўтар кароткіх прадмовак да таго ці іншага мастацкага твора) — вядомы пісьменнік Алесь Бадак. У «Казачнай энцыклапедыі...» — творы Алеся Якімовіча («Звяры нашых лясоў»), Міколы Чарняўскага («Каго баіцца зубр?»), Сяргея Грахоўскага («Ласяня»), Яраслава Пархуты («Свінтушок», «Казка пра Ваўка»), Віктара Гардзея («Лясныя парасяты», «Працавіты вожык», «Змяя і вожык»), Расціслава Бензерука («Дружбакі»), Рыгора Ігнаценкі («Лістапад у лесе», «У арэхах», «Грыбнік»), Анатоля Бензерука («Малінавы чай»), Алены Васілевіч («Калінавая рукавічка»), Янкі Галубовіча («Салодкі клянновік»), Васіля Віткі («Жаўна», «Дзятлік», «Крыжадзюб»), Генадзя Аўласенкі («Хто як зімуе?») і іншых паэтаў і празаікаў. Зборнік афармілі мастачка Марыся Вярцейка. Яе малюнкі настолькі цікавыя, што, як мне падаецца, іх можна нават асобна выдаваць паштоўкамі, якія стануць цудоўным падарункам дзеткам.

Характар кнігі вызначаюць не толькі мастацкія творы, а яшчэ і кароткія артыкулы-прадмоўкі Алеся Бадака, які, напрыклад, перад знаёмствам ці поруч, ці пасля падае інфармацыю фактаграфічнага, пазнавальнага характару. Напрыклад, следам за вершам «Дзятлік» Васіля Віткі ён расказвае пра цікавыя факты, звязаныя з жыццём дзятла, — пра дупло дзятла, яго птушанят, пра тое, як кормяць бацькі-дзятлы сваіх гадаванцаў («За суткі ... прыносяць корм да дупла 200, а то і больш разоў. Залежыць гэта не толькі ад колькасці дзяцей..., але і ад надвор'я, а таксама ад узросту птушанят»).

Мікола БЕРЛЕЖ.

Час і людзі

«А МЫ ЗАВАЮЕМ ЦАЛІНУ...»

У Нацыянальнай бібліятэцы была прэзентавана кніга Наталлі Ражновай «Цаліне 70 гадоў». Аўтар сабрала гісторыі людзей, якія ў 1954—1962 гадах прыехалі з Беларусі асвойваць гэтыя землі. Яна працавала ў музеях і архівах, сустракалася з нашчадкамі, якія дзяліліся дакументамі і сямейнымі фатаграфіямі. Спецыяльна для выдання казахскія мастакі перадалі з запаснікаў свае работы тых часоў, каб іх можна было адфатаграфаваць і выкарыстаць у кнізе.

Гэта быў найвялікшы патрыятызм таго часу. Сярод моладзі гучаў лозунг: «Нашы бацькі заваявалі Перамогу, а мы заваюем цаліну», — заўважыла аўтарка. Гэта не былі проста прыгожыя словы, людзі сапраўды верылі ў свае сілы, у тое, якую добрую справу здольны зрабіць.

Па розных крыніцах, як заўважыў старшыня беларускага цэнтра «Радзіма» Дзмітрый Астаньковіч, у 50-х гадах у Казахстан прыехала каля мільёна добраахвотнікаў з усяго СССР, сярод іх — сто тысяч беларусаў, для многіх з іх пасля казахстанская зямля стала другой радзімай. Дзякуючы іх працоўнаму подзвігу, Казахстан сёння ўваходзіць у першую дзясятку краін па аб'ёме экспарту збожжа. Новая кніга, як упэўнены Дзмітрый Астанькоўіч, дазваляе зразумець, што зрабілі цаліннікі і дзеля чаго ішлі на такія складанасці.

